Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
11 КРАСАВІКА 2020 г. СУБОТА
№ 71 (29185)

## СВЕТЛЫЯ ДНІ ВЯЛІКАГА СВЯТА

*Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Вялікдзень 12 красавіка 2020 года*

Дарагія суайчыннікі!

Ад усёй душы віншую вас з Уваскрэсеннем Хрыстовым.

Светлыя дні гэтага вялікага свята нагадваюць нам аб выратавальнай надзеі, стваральнай міласэрнасці і ўсёабдымнай любові, напаўняюць сэрца хрысціянскай мудрасцю.

Мы шчыра дапамагаем бліжнім, абараняем слабых, аб'ядноўваемся перад тварам выпрабаванняў. І з новымі сіламі ствараем будучыню, у якой ёсць дастойнае месца кожнаму чалавеку.

Няхай узвышаныя імкненні да дабра і справядлівасці застануцца непарушным фундаментам міру і згоды ў беларускім грамадстве, а святочны велікодны настрой цягнецца як мага даўжэй.

Хачу пажадаць вам душэўнай цеплыні, узаемаразумення ў сямейным асяроддзі, поспехаў ва ўсіх справах.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# УВАСКРАСЕННЕ ХРЫСТА — ЗАДАТАК БУДУЧАЙ СЛАВЫ

## Пастырскае пасланне на Вялікдзень 2020

Хрыстус уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!

Глыбокапаважаныя святары, кансэкраваныя асобы, браты і сёстры, суайчыннікі, людзі добрай волі!

Сардэчна віншую вас са святам Вялікадня — святам нашай веры і надзеі на вечнае жыццё. Гэтая праўда з'яўляецца галоўным пасланнем свята Уваскрасення Хрыста. Пра яе мы, хрысціяне, павінны заўсёды памятаць і ёю жыць. Яе актуальнасць падкрэслівае таксама і выкліканая пандэміяй каранавіруса сітуацыя, у якой уваскрасенне Хрыста з'яўляецца промнем надзеі, нават насуперак надзеі (Рым 4, 18). Як Езус выйшаў жывы з цёмнай магілы, гэтак і мы верым, што дзякуючы Богу, намаганням лекараў і адказных за грамадскі парадак, якім мы бязмерна ўдзячныя за іх ахвярнае служэнне, таксама зможам паспяхова выйсці з цемры эпідэміі, якая ахінула зямлю, у святло жыцця.

Сёння мы павінны засяродзіць нашу ўвагу на тым, што адбылося ў Пасхальную ноч. Праўда ўваскрасення Хрыста азначае, што смерць — гэта не канец, што яна не мае апошняга слова, што гэта толькі дзверы ў будучыню. Таму мы не можам дазволіць, каб гэтая праўда знікла



з нашага жыцця. Яна павінна быць яго цэнтрам, і нам нельга страціць яе сэнсу.

Пасха заклікае да пытанняў, на якія неабходна даць адказ. Які сэнс жыцця? Якая яго мэта? Дзе знаходзяцца сэрца і думкі чалавека падчас яго зямнога жыцця? Часовае жыццё на зямлі — гэта падрыхтоўка да вечнасці. Калі мы не імкнёмся да гэтага, то становімся падобныя да карабля, які сеў на мель. Карабель ёсць, але не можа плысці, а яго прызначэнне — перавозіць людзей або грузы. Таксама і мы калі не засяроджваемся на галоўнай праўдзе нашай веры — уваскрасенні Хрыста, — то жывём без яснай мэты.

Сёння перад перспектывай нашай будучыні, якую нам адкрывае праўда ў Уваскрасення, неабходна засяродзіцца на некаторых тэндэнцыях жыцця сучаснага чалавека. Матэрыяльныя каштоўнасці, дух спажывальніцтва, задавальненні і прасоўванне па кар'ернай лесвіцы з'яўляюцца галоўнымі крытэрыямі паспяховасці сучаснага чалавека.

Касцёл не супраць таго, каб чалавек жыў заможна, і шмат робіць для таго, каб свет развіваўся згодна з прынцыпамі сацыяльнай справядлівасці. Аднак імкненне да ўзбагачэння любой цаной, можа нават ідучы па касцях іншых людзей, і абагаўленне матэрыяльных каштоўнасцяў несумяшчальнае з маральнымі нормамі хрысціянства. Успомнім евангельскі аповед пра чалавека, які сабраў багаты ўраджай і казаў сабе, што можа адпачываць, есці, піць і весяліцца. На гэта Бог яму сказаў, што ўжо гэтай ноччу забярэ яго душу, і каму тады дастануцца ўсе яго багацці? (Лк 12, 16—21)

Вялікую заклапочанасць выклікае адыход ад традыцыйных хрысціянскіх каштоўнасцяў і выбар амаральнага стылю жыцця. Укараняецца секулярызм і вельмі небяспечны маральны рэлятывізм, які не прызнае абсалютнай праўды і ўсё лічыць адносным. Прапагандуецца неабмежаваная свабода без маральнай адказнасці. Такі шлях вядзе да размывання сапраўдных каштоўнасцяў і ўсёдазволенасці.

Вялікай праблемай з'яўляецца заняпад духоўнага жыцця, найперш малітвы. Сучасны чалавек настолькі заняты часовымі справамі, што не мае часу маліцца. Цяжка зразумець таго, хто кажа, што верыць у Бога, але не моліцца і не ставіць малітвы ў цэнтр свайго жыцця.

У выніку, замест таго каб піць з крыніцы чыстай вады Божай ласкі, мы аддаём перавагу бруднай жыжы з дамешкамі секулярных і антыхрысціянскіх інгрэдыентаў. У сучасным прагматычным свеце, скіраваным на спажывальніцтва і задавальненне, дзе ўсё купляецца і прадаецца, няма месца духоўнасці, справядлівасці і маралі. Усё знаходзіцца ў палоне часовасці.

Пасхальная праўда адкрывае перад намі новую перспектыву вечнасці, бо і мы ўваскрэснем, як Хрыстус уваскрос. Запэўнівае нас у гэтым святы апостал Павел, які ў Першым пасланні да Карынфян кажа: «Як у Адаме ўсе паміраюць, так і ў Хрысце ўсе будуць ажыўлены. Кожны ў свой час: першы Хрыстус, потым тыя, хто належыць Хрысту, падчас прыйсця Ягонага» (1 Кар 15, 22—23).

СТАР. 5

# «НАМ ТРЭБА БОЛЬШ СПАЖЫВАЦЬ ЧЫСТАЙ ЭНЕРГІІ»

З першых вуснаў

## Прэзідэнт разгледзеў прапанаваныя ўрадам стымулы для павелічэння энергаспажывання насельніцтвам

**Унесены ўрадам на разгляд кіраўніка дзяржавы праект Указа «Аб кампенсаванні расходаў на электразабеспячэнне эксплуатаванага жыллёвага фонду» Прэзідэнт абмеркаваў з намеснікам прэм'ер-міністра Юрыем Назаравым і міністрам энергетыкі Віктарам Каранкевічам. Мэта дакумента — забяспечыць эфектыўную інтэграцыю Беларускай атамнай электрастанцыі ў энергасістэму краіны.**

«З'явяцца дадатковыя аб'ёмы электрычнай энергіі, — адзначыў Прэзідэнт. — Як я часта казаў, нам яе трэба спажываць больш, гэта — чыстая энергія, і сёння трэнд у свеце ўвогуле — пераход на чыстую энергію. Ну і мы ***менш будзем залежаць ад прыроднага газу: мільярдаў на пяць «кубоў» менш будзем спажываць, па нашых разліках».***

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму пажадаў выслухаць профільнага міністра і віцэ-прэм'ера.

«Мне патрэбна тут адпаведная ваша кансультацыя: з чаго мы зыходзім, — сказаў ён. — Каб мы не перакінулі гэта пытанне цалкам на насельніцтва. Улік павінен быць арганізаваны. Калі мы проста запішам на паперы, а насельніцтва акажацца няздольнае гэта зрабіць — вось гэта мяне больш за ўсё хвалюе».

Людзей трэба стымуляваць да спажывання электрычнай энергіі, пагадзіўся беларускі лідар. «Гэта і больш бяспечна, ды і з пункту гледжання эканомікі важна, я цалкам падтрымліваю, — дадаў ён. — І, вядома, трэба падштурхоўваць людзей, я з гэтым таксама згодны. Але штуршок не павінен быць смяротны, калі казаць проста, панароднаму. Гэта мяне больш за ўсё турбуе, каб усё было спакойна, паступова».

Віцэ-прэм'ер Юрый Назараў заўважыў, што праект указа — ужо другі крок у кірунку стымулявання насельніцтва да больш актыўнага спажывання электраэнергіі.

Летась, па яго словах, было прынята рашэнне пра індывідуальныя тарыфы на спажыванне электрычнай энергіі для насельніцтва. Людзі сталі павялічваць спажыванне электрычнасці, актывізавалася будаўніцтва новых дамоў з выкарыстаннем электрычнай энергіі для прыгатавання ежы і ацяплення, гарачага водазабеспячэння. Віцэ-прэм'ер запэўніў, што з боку Мінэнерга ідзе сістэмная работа ў гэтым кірунку.

Праект указа ахоплівае менавіта ўжо існуючы жылы фонд, растлумачыў журналістам міністр энергетыкі Віктар Каранкевіч.

«Гэты праект указа быў ухвалены, адзінае — даручана разгледзець магчымасць даць права мясцовым органам улады павялічваць сумы падтрымкі для сацыяльна ўразлівых груп, — паведаміў міністр пасля даклада кіраўніку дзяржавы. — Указ дазволіць павялічыць электраспажыванне ў краіне і палепшыць умовы пражывання людзей, у першую чаргу ў тых населеных пунктах, дзе адсутнічае цэнтралізаванае газа- і цеплазабеспячэнне».

### Што ў дакуменце?

Праект указа прадугледжвае кампенсацыю грамадзянам Беларусі за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў у памеры 20 працэнтаў (але не больш за 40 базавых велічынь) ад кошту выкананых работ (уключаючы выдаткі на набыццё электраабсталявання) па электразабеспячэнні эксплуатаванага жыллёвага фонду для патрэб ацяплення, гарачага водазабеспячэння і прыгатавання ежы. Размова ідзе пра аднакватэрныя (блакіраваныя) жылыя дамы. Пакрыццё расходаў будзе адбывацца аднаразова па рашэнні ўласніка жылога дома.

Па ацэнцы «Белэнерга», арыенціровачныя выдаткі грамадзяніна на выкананне работ па электразабеспячэнні на ўказаныя мэты аднаго аднакватэрнага жылога дома складаюць парадку пяці тысяч рублёў. Такім чынам, кампенсацыя часткі выдаткаў на аднаго грамадзяніна можа скласці каля адной тысячы рублёў.

Для магчымасці атрымання кампенсацыі грамадзяне, згодна з праектам указа, павінны быць уключаны мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ў адпаведныя спісы.

У такія спісы не будуць уключаныя грамадзяне, калі:

— кампенсацыя расходаў ужо адбылася;

— жылы дом мае цэнтралізаванае газазабеспячэнне і (або) цеплазабеспячэнне;



— жылы дом размешчаны ў зонах з правам на адсяленне і ў зонах наступнага адсялення;

— прынята рашэнне аб пераводзе эксплуатаванага жыллёвага фонду з цэнтралізаванага цеплазабеспячэння і гарачага водазабеспячэння на індывідуальнае (такія работы ў поўным аб'ёме фінансуюцца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў);

— грамадзяне раней газіфікавалі жылыя дамы з выкарыстаннем бюджэтных сродкаў і (або) ільготных крэдытаў.

СТАР. 2

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Еўропа прыняла план па выратаванні эканомікі



Савет міністраў фінансаў зоны еўра ўзгадніў план падтрымкі эканомікі ЕС ва ўмовах пандэміі сумарным аб'ёмам 500 мільярдаў еўра. Відэаканферэнцыя Еўрагрупы завяршылася пад апладысменты. Кіраўнік Мінфіна Францыі Бруно Ле Мэр ужо назваў вынікі нарады «выдатнай навіной». Паводле яго слоў, гэта важны дзень у гісторыі Еўрасаюза. Папярэдняя сустрэча працягвалася больш за 16 гадзін і завяршылася безвынікова з-за рознагалоссяў паміж Нідэрландамі і Італіяй. Пытанне выпуску так званых каранабондаў, вакол якога краіны вялі спрэчкі, не вырашана. Удзельнікі нарады ў выніку палічылі яго не такім тэрміновым. Праграма дапамогі павінна аб'яднаць прапанаваныя раней інстытутамі ЕС меры і схемы аказання дапамогі розным сферам эканомікі супольнасці.

### Сто тысяч маракоў затрымаліся на суднах з-за каранавіруса

Каля 100 тысяч маракоў па ўсім свеце не могуць пакінуць судны з-за распаўсюджвання каранавіруса, паведаміла Deutsche Welle са спасылкай на прадстаўнікоў профільных прафсаюзаў. Парты па ўсім свеце ўвялі абмежаванні, каб стрымаць пашырэнне інфекцыі. Сярод іх — забароны на ўваход у гавані ці абавязковы каранцін для экіпажаў. Ускладняе сітуацыю і неабходнасць запаўняць фармуляры пра здароўе каманды, а таксама адсутнасць магчымасці вярнуцца дадому на самалёце з-за адмены рэйсаў. Міжнародная палата суднаходства і міжнародныя профільныя прафсаюзы звярнуліся з сумесным лістом да ўрадаў краін G20. Аўтары дакумента заклікалі ўлады прадугледзець магчымасць пакінуць карабель пры ўмове захавання ўсіх мер бяспекі, а таксама забяспечыць медыцынскі агляд маракоў на беразе, бо на гандлёвых суднах няма ўрачоў.



ISSN 1990 - 763X
20071>
9 771990 763008

### Жыхарка Індыі дзеля сына праехала на скутары 1,4 тысячы кіламетраў



Пра гэта паведаміла выданне India Today. Разія Бегум працуе ў дзяржаўнай школе ў Нізамабадзе — горадзе на поўначы штата Тэлангана — і гадуе двух сыноў. Адзін з іх скончыў інжынерны факультэт, другі вучыцца на ўрача і ў сярэдзіне сакавіка адправіўся ў горад Нелуру на паўднёвым усходзе штата Андхра-Прадэш, каб дапамагчы захварэламу бацьку свайго сябра. Неўзабаве пасля гэтага ўрад Індыі абвясціў аб увядзенні рэжыму ізаляцыі на 21 дзень. «Гэта было цяжкае падарожжа. Было вельмі страшна ехаць ноччу па дарогах, дзе няма аўтамабіляў і людзей. Але рашучасць вярнуць майго сына пераадолела ўвесь мой страх», — сказала жанчына, якая для гэтага падарожжа атрымала ў паліцыі дазвол на перасячэнне граніцы з суседнім штатам.

## КОРАТКА

- **«Белпошта» аднавіла працу поштаматаў.**
- Забарона на наведванне лясоў дзейнічае ў 52 раёнах Беларусі.
- **Імянная лаўка кампазітара Эдуарда Ханка з'явілася ў Гарадскім садзе Брэста.**



- Агульная колькасць тых, хто захварэў на COVID-19 у свеце, перавысіла 1,6 мільёна.
- **Беларускія мытнікі штодня афармляюць звыш 3,7 тысячы тон тавараў першай неабходнасці.**
- Інфляцыя ў Беларусі ў сакавіку склала 0,9 %.
- **Расія і Саудаўская Аравія дамовіліся аб скарачэнні здабычы нафты тэрмінам на два гады.**
- Эканамісты прагназуюць у ЗША рэкордны з 1940-х гадоў узровень беспрацоўя.

З нагоды

# 2021-Ы — ГОД МАРСА

## Касмічныя падарожжы, ядзернае смецце і карысныя выкапні з метэарытаў

**Навошта лятаць у космас, як гучаць зоркі, калі чалавецтва трапіць на Альфу Цэнтаўра, наколькі небяспечная касмічная радыяцыя для чалавека... Усё гэта і мноства іншых неверагодных рэчаў ведае Гарык ІСРАЕЛЯН, астрафізік Інстытута астрафізікі Канарскіх астравоў (Іспанія), творчы дырэктар міжнароднага фестывалю навукі і мастацтва STARMUS (Stars and Music). Навуковец упэўнены, што тыя, хто адкрывае для сябе касмічны Сусвет, гатовы змяніць сябе і жыццё на Зямлі. Напярэдадні Дня касманаўтыкі эксперт расказаў карэспандэнту «Звязды» пра найноўшыя касмічныя дасягненні і мары чалавецтва.**

### Плутоній — для нашай Галактыкі, амерыцый — для іншай

**— Беларусь будуе першую атамную станцыю і ўваходзіць у клуб «атамных краін». Аднак атам — гэта не толькі энергетыка. Адна з галін прымянення атамных тэхналогій — космас. Наколькі актыўна цяпер выкарыстоўваецца атам у космасе, якія новыя распрацоўкі ў плане прымянення ядзернай энергіі існуюць?**

— Атам выкарыстоўваецца ў космасе ў выглядзе маленькіх атамных рэактараў, калі неабходную колькасць энергіі немагчыма атрымаць іншымі спосабамі,



напрыклад ад сонечных батарэй, ізатопных крыніц. А таксама як радыеактыўныя крыніцы энергіі.

У касмічных апаратах самы распаўсюджаны — радыеізатопны тэрмаэлектрычны генератар, які стварае энергію дзякуючы распаду цяжкіх ізатопаў (плутонію-238, кюрыю-244, стронцыю-90). Выхадная магутнасць такіх апаратаў — некалькі соцень ват, і гэта асноўная крыніца электрасілкавання на касмічных апаратах. Такія генаратары выкарыстоўваліся ў зондах «Новы гарызонт», «Ваяджэр», «Касіні». На 10 кілаграмах дыяксіду плутонію-238, напрыклад, працуе ўжо 14 гадоў запушчаны ў 2006-м на Плутон зонд «Новы гарызонт». На гэткім жа паліве функцыянуюць зонды «Галілеа», які адпраўлялі на Юпіцер, «Касіні» — на Сатурн, марсаход «Кьюрыасіці».

СТАР. 2

# «НАМ ТРЭБА БОЛЬШ СПАЖЫВАЦЬ ЧЫСТАЙ ЭНЕРГІІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вяртацца частка расходаў будзе пасля завяршэння работ па электразабеспячэнні і прадстаўлення грамадзянінам у мясцовы выканкам неабходных дакументаў (акт выкананых работ, дакументы, якія пацвярджаюць набыццё абсталявання і матэрыялаў).

Па словах Віктара Каранкевіча, у 2019 годзе было каля 11 тысяч зваротаў грамадзян, якім выдадзеныя тэхнічныя ўмовы на перавод іх дамоў на электрычнае цеплазабеспячэнне. «Мы бачым, што такіх дамоў вялікая колькасць, — пракаментаваў ён. — У першым квартале колькасць грамадзян, якія атрымалі тэхнічныя ўмовы на перавод жыллёвага фонду, складае каля 3,3 тысячы. З улікам фактычных звестак за мінулы год і першы квартал гэтага мы разлічваем, што сума падтрымкі (з боку мясцовых бюджэтаў. — **«Зв.»**) складзе каля 4-5 мільёнаў рублёў у год».

На пытанне карэспандэнта «Звязды», ці азначае гэта, што любы вясковы дом з пячным ацяпленнем можна будзе перавесці на абаграванне праз электрапрыборы і чакаць 20-працэнтную кампенсацыю выдаткаў, міністр адказаў наступным чынам:

«Так. Там, дзе ёсць тэхнічная магчымасць павелічэння нагрузкі на электрычныя сеткі, любы грамадзянін можа звярнуцца ў «Адно акно» ў выканкам з просьбай даць дазвол на адпаведную рэканструкцыю жылога дома».

Там, дзе тэхнічнай магчымасці няма, у планы мадэрнізацыі электрычных сетак будуць закладвацца адпаведныя сумы, і цягам праграмы на 2021—2025 гады гэтыя электрасеткі будуць мадэрнізавацца, запэўніў кіраўнік ведамства.

Урад плануе дапоўніць дакумент яшчэ адной нормай і ўнесці на подпіс Прэзідэнту цягам тыдня.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

ЕАЭС

# Граніцы закрыты, але мы разам

**На наступным тыдні кіраўнікі дзяржаў — члены Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ў фармаце відэаканферэнцыі абмяркуюць сумесныя меры рэагавання на сітуацыю з каранавірусам**

Не менш важнай тэмай стане работа па аднаўленні эканамічнага росту ў паслякрызісны перыяд. Пра гэта заявіў **прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС** на пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета.

Нягледзячы на складаную сітуацыю, чарговае пасяджэнне адбылося ў загадзя дамоўлены тэрмін, хай і ў нязвыклым фармаце — у рэжыме відэаканферэнцыі.

«Несумненна, жыццё ўносіць пэўныя карэктывы. Мы былі вымушаны адмяніць прымеркаваны да нашага пасяджэння міжнародны форум па дасягненні Мэт устойлівага развіцця і адкласці правядзенне Еўразійскага эканамічнага форуму», — нагадаў Сяргей Румас.

Старшыня Еўразійскага міжурадавага савета падкрэсліў важнасць таго, што ўсе органы савета працягваюць работу па прасоўванні інтэграцыйнага парадку дня.

«Відавочна, што найбліжэйшыя прагнозы па развіцці нацыянальных эканомік негатыўныя. Сёння няма адназначных ацэнак па тэрмінах і кошце для пераадолення пандэміі. Нельга выключаць, што мы проста вымушаны будзем стаць як мінімум на час агульным, але пры гэтым самадастатковым рынкам», — прадказаў кіраўнік беларускага ўрада.

Па словах Сяргея Румаса, краінам ЕАЭС варта нацэліцца на сур'ёзную дэдаларызацыю эканомікі саюза, кардынальна павялічыць фарміраванне цэн і разлікаў у нацыянальных валютах за тавары і паслугі, што пастаўляюцца ў рамках рынка ЕАЭС, асабліва паліўна-энергетычныя і сыравінныя тавары.

Старшыня Еўразійскага міжурадсавета адзначыў, што пандэмія прадэманстравала важнасць правядзення ў саюзе агульных палітык у сферы прамысловасці і аграпраму, сумесных праграм імпартазамяшчэння ў найважнейшых галінах. Таму Сяргей Румас запрасіў калег падтрымаць такі настрой і ўзгадніць праект стратэгічных кірункаў развіцця еўразійскай інтэграцыі да 2025 года.

Пра тое, што санітарна-эпідэміялагічная абстаноўка ў свеце застаецца напружанай, сказаў і **старшыня Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

«У гэтых умовах важна каардынаваць нацыянальныя антыкрызісныя рашэнні і прымаць сумесныя меры», — упэўнены ён.

Міхаіл Мясніковіч паведаміў, што Еўразійская эканамічная камісія перабудавала сваю дзейнасць, накіраваўшы намаганні на ўрэгуляванне вострых пытанняў узаемнага гандлю, якія ўзнікаюць штодня, выпрацоўку з урадамі сумесных мер па забеспячэнні эканамічнай стабільнасці і процідзеянні каранавіруснай інфекцыі.

Па словах старшыні Калегіі ЕЭК, становішча на рынку харчавання і тавараў прамысловага попыту маніторыцца штодзённа, дзейнічаюць часовыя абмежаванні на экспарт за межы саюза істотнай групы тавараў, устаноўлены нулявыя стаўкі ўвазных мытных пошлін на асобныя тавары і групы тавараў крытычнага імпарту — у першую чаргу медыцынскіх сродкаў аховы і медтэхнікі. Выпрацаваны комплекс сумесных антыкрызісных мер для сферы паслуг, на якую асабліва ўплывае турбулентнасць фінансавых рынкаў.

«Мяркуем, што гэтыя дзве ключавыя задачы — барацьба з інфекцыяй і работа эканомікі ў такіх умовах — надзвычайна важныя і мусяць вырашацца ў комплексе», — падвёў вынік Міхаіл Мясніковіч.

На яго думку, важна, што Савет не абмяжоўваецца бягучымі трывожнымі пытаннямі, але імкнецца найлепшым чынам выбудаваць адносіны надалей, аж да 2025 года.

«Сёння ўсе кіраўнікі ўрадаў безумоўна адзначылі, што наш саюз у такіх экстрэмальных умовах не толькі выпрабаваны на трываласць, але і ўсе пераканаліся ў тым, што ён дастаткова эфектыўны, бо ў рэжыме рэальнага часу вырашаюцца пытанні, якія без саюзных адносін вырашаліся б дастаткова доўга», — паведаміў журналістам старшыня Калегіі ЕЭК. У прыклад ён прывёў перамяшчэнне тавараў і мытныя працэдуры.

Па словах Міхаіла Мясніковіча, па ўсіх дзевяці пытаннях парадку дня, разгледжаных на пасяджэнні, прынятыя станоўчыя рашэнні.

**Варвара МАРОЗАВА.**


**ТЕХНОБАНК**

Открытое акционерное общество
220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44

Открытое акционерное общество «Технобанк» настоящим уведомляет акционеров о принятии внеочередным Общим Собранием акционеров ОАО «Технобанк» от 02.04.2020, протокол № 3, решений о крупных сделках, о внесении изменений в Устав ОАО «Технобанк», о праве акционеров требовать выкупа акций в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь. Для реализации своего права требовать выкупа акций акционеру необходимо представить в письменном виде в ОАО «Технобанк» по адресу: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44, соответствующее заявление произвольной формы на имя Председателя Правления ОАО «Технобанк» в течение 30 дней со дня проведения Общего Собрания акционеров, на котором были приняты решения, повлекшие возникновение права требовать выкупа акций (02.04.2020). ОАО «Технобанк» по результатам рассмотрения поданных заявлений с требованиями о выкупе акций в течение 70 дней с даты поступления заявления в банк удовлетворяет требования акционеров либо в течение 30 дней сообщает акционерам об отказе в удовлетворении требований акционеров.

При необходимости получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44, в любое удобное время с 11.00 до 15.00 (кроме выходных и праздничных дней) с предъявлением документов, подтверждающих личность и полномочия.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 03.05.2019. УНП 100706562


# 2021-Ы — ГОД МАРСА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тым не менш, каб выйсці за межы Сонечнай сістэмы, такіх магчымасцяў недастаткова. Таму ў 2003 годзе НАСА распачало праект для міжзоркавых палётаў, дзе ў апараце выкарыстоўваецца прынцыпова новы ізатоп з большым часам распаду. Каб апарат мог ляцець, скажам, 1000 гадоў, патрэбны ізатоп, у якога час паўраспаду не 88 гадоў, як у плутонію, а 450-500 гадоў, як у амерыцыю-241.

**— Упершыню ядзерны рэактар вывелі на арбіту яшчэ ў 1965 годзе. Амерыканская ўстаноўка SNAP-10A прапрацавала 43 дні. Ці змянілася з таго часу выкарыстанне ядзерных рухавых і энергетычных установак? Якое прыстасаванне цяпер найбольш эфектыўнае ў плане энергааддачы і працаздольнасці ва ўмовах космасу?**

— SNAP-10A працаваў на ўране-235. Магутнасць яго больш чым у 10 разоў перавышала здольнасці радыеактыўных генератараў. Аднак такія апараты могуць працаваць толькі некалькі месяцаў, а не дзесяцігоддзі. І вучоныя ўвесь час намагаліся павялічыць магутнасць ядзерных установак. У 2017 годзе ў ЗША пачалі распрацоўваць праект Kilopower з ядзерным рэактарам, які зможа даставіць устаноўку на Марс і працаваць дзесяць гадоў. Яго магутнасць ужо 10 кВт, што ў 20 разоў перавышае магчымасці першай устаноўкі.

## Карабель пакаленняў, або Палёт даўжынёй 130 гадоў

**— Наколькі далёка ў космас можа ўжо прасунуцца чалавецтва дзякуючы асвоеным атамным тэхналогіям? Ці з'явяцца атамныя ракеты і наколькі небяспечныя яны будуць для экіпажа?**

— Зонды з радыеактыўнасцю працуюць у космасе без праблем, а вось іх пілатаванне — складаная справа. Ядзерныя імпульсныя рухавікі, якія змогуць разганяцца да 10 тысяч кіламетраў у секунду, — з'ява будучыні. Такія праекты распачыналіся ў ЗША і Савецкім Саюзе ў канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя. Сярод задум праекта «Арыён», напрыклад, было стварэнне «карабля пакаленняў» вагой 40 мільёнаў тон на 20 тысяч чалавек. Быў і паменшаны варыянт ядзернага зоркалёта вагой 100 тысяч тон, які, як лічылася, мог даляцець да Альфы Цэнтаўра за 130 гадоў. Значыць, цягам некалькіх пакаленняў на караблі людзі трапілі б за межы Сонечнай сістэмы.

У 2017-м кітайцы заявілі, што да 2045 года зробяць уласны ядзерны рухавік. А амерыканцы з 2013-га ствараюць ядзерны цеплавы рухавік для палётаў на Марс. Ідэя ў тым, каб скараціць час падарожжа мінімум удвая, да некалькіх месяцаў замест года. Лічыцца, што з такім рухавіком за два-тры месяцы можна даляцець і да Плутона, а на зваротны шлях спатрэбіцца тры-чатыры месяцы.

Аднак адна з асноўных праблем пры гэтым — доза радыяцыі ў дзесяціразовым памеры, якую атрымліваюць касманаўты, і пазбавіцца ад гэтай небяспекі немагчыма. Адзінае выйсце — ляцець і вяртацца як мага хутчэй. Але і ў такім выпадку касманаўт можа атрымаць такую дозу, што палёт стане апошнім у яго жыцці. Магчыма, у будучыні і вынайдуць матэрыялы, здольныя ствараць вакол зоркалёта магутнае магнітнае поле. Ну або карабель зможа дасягаць такіх хуткасцяў, пры якіх будзе дастаткова энергіі для стварэння штучнага магнітнага поля вакол апарата, што стане ахоўнай абалонкай супраць радыеактыўных промняў.




**Прэзентацыя медаля фестывалю STARMUS імя Сцівена Хокінга за камунікацыю ў навуцы. Ім узнагароджваюцца асобы (акрамя навукоўцаў), якія зрабілі вялікі ўнёсак у справу папулярызацыі навукі. На фота (Лондан, 2015 г.) члены савета STARMUS: астрафізік Гарык ІСРАЕЛЯН; касмолаг, астрафізік Сцівен ХОКІНГ (вобраз гэтага вучонага, які памёр у 2018-м, увасоблены на медалі); савецкі касманаўт, які ўпершыню выйшаў у адкрыты космас, Аляксей ЛЯВОНАЎ; гітарыст групы Queen Браян МЭЙ; брытанскі вучоны-этолаг Рычард ДОКІНЗ; брытанскі хімік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Харальд КРОТА.**

**— Ці павялічыліся шанцы людзей адшукаць іншапланетнае жыццё ў космасе?**

— З дапамогай ядзерных ракет можна даляцець да зорак, што знаходзяцца ў радыусе дзесяці светлавых гадоў ад Сонечнай сістэмы. Каб ажыццяўляць далёкія міжзоркавыя палёты, патрэбны анігіляцыйныя рухавікі, якія дазваляць разагнаць зоркалёт да калясветлавых хуткасцяў. Пакуль гэта рэальна толькі ў тэорыі, бо на караблі павінен быць экіпаж для кіравання.

## Касмічныя турысты, навукоўцы і музыкі

**— Адзін з ультрасучасных кірункаў турызму — касмічны. Наколькі бяспечны для людзей выхад на арбіту Зямлі, тым больш у адкрыты космас у скафандры? Наколькі рэальна адкрыццё гатэля на арбіце ў складзе Міжнароднай касмічнай станцыі, які, як мяркуецца, можна будзе стварыць ужо да 2025 года?**

— Думаю, касмічны турызм — неблагая ідэя. Аднак нельга, каб гэта стала асноўнай крыніцай даходаў для развіцця касмічнай індустрыі. Але ён можа быць добрай базай для папулярызацыі навукі, бо любы касмічны турыст, які бачыў Зямлю збоку, становіцца іншым чалавекам, становіцца паслом навукі.

Між тым развіццё касмічных тэхналогій — справа дзяржавы, а людзі вядомыя і заможныя павінны дапамагаць у гэтым. Аднак варта памятаць, што космас — гэта не бізнес, а перш за ўсё навуковыя даследаванні. За невялікі час у космасе, дарэчы, людзі атрымліваюць маленькую дозу радыяцыі, бяспечную для арганізма.

**— Вы даследуеце, у прыватнасці, распаўсюджванне акустычных хваляў у атмасферах зорак — пераклалі іх гукавыя калыханні ў дыяпазон, які чалавек успрымае на слых, і напісалі на гэтай базе музыку. Цяпер кіруеце фестывалем навукі і мастацтва STARMUS. Ці спрыяе ён разуменню людзьмі касмічных і экалагічных праблем?**

— Асноўная роля нашага фестывалю, які доўжыцца тыдзень і мае дэвіз «Адкрывайце космас і мяняйце свет», — натхняць людзей. Мы ўпэўнены, што натхнёны чалавек сам, без прымусу, будзе жадаць вучыцца і спасцігаць новае. Гэтаму прысвечаны і ўсе нашы панэльныя дыскусіі, і музычныя выступленні, дзе музыка сінхранізавана з навукай. Многія музыканты кажуць, што іх вельмі натхняе космас. І калі трымаць музыку з яе эмоцыямі блізка да навукі, апошняя ад гэтага толькі выйграе. Пасля фестывалю нараджаюцца нават сумесныя праекты паміж навукоўцамі і музыкантамі. На ўсіх фестывалях у нас прысутнічаюць і касманаўты.

Наступны фестываль пройдзе ў 2021 годзе ў Арменіі і будзе прысвечаны 50-годдзю першай мяккай пасадкі на Марс савецкага апарата «Марс-3». Першы марсаход, дарэчы, дапамагаў чысціць дах рэактара ў Чарнобылі ад радыеактыўнага матэрыялу, так што гэта прыклад таго, як космас дапамог Зямлі. Сёлета на Чырвоную планету адпраўляюць яшчэ чатыры праекты. Так што наступны год стане годам Марса.

## Звалка па-за межамі Сонечнай сістэмы і чыстая энергія

**— Існуе меркаванне, што ў 2030-м на Зямлі можа здарыцца экалагічная катастрофа, калі парніковы эфект накрые планету, аднак лічыцца, што атамная энергетыка дапаможа чалавецтву прадухіліць бяду. Ці так гэта?**

— Калі не ствараць вуглякіслы газ, а пераходзіць на чыстыя крыніцы энергіі, то сітуацыя з часам, пэўна, выправіцца. У свеце працуе каля 240 атамных станцый, а атамная энергетыка і заклікана абмежаваць стварэнне колькасці вуглякіслага газу. Аднак самая экалагічна чыстая энергія — тэрмаядзерны сінтэз. Цяпер прапрацоўваецца праект ITER па будаўніцтве першай тэрмаядзернай станцыі, ад работы якой няма ні радыеактыўнасці, ні адходаў, а магутнасці — у тысячы разоў перавышаюць магчымасці ядзернай станцыі. Гэта можа вырашыць усе энергетычныя праблемы ў свеце. Па разліках некалькіх літраў вады, перапрацаваных у энергію, хопіць для ўсёй планеты.

**— А наколькі рэальна здабываць карысныя выкапні з касмічных метэарытаў, каб эканоміць зямныя запасы?**

— Існуе праект, задача якога — адшукаць карысныя выкапні і мінералы ў метэарытах. Аднак каб рэалізаваць гэта, найперш патрэбны караблі, прычым іх вытворчасць мусіць быць наладжана ў прамысловых маштабах. Тым не менш арганізатары праекта да 2030 года намерваюцца здзейсніць першы пошукавы эксперымент. Многія лічаць, што здабываць выкапні з метэарытаў будзе надта дарага. Магчыма, лепш збудаваць базу на паверхні Месяца і рабіць гэта там. Аднак пры гэтым паўстае заканадаўчае пытанне, ці можна распрацоўваць метэарыт, які пападзецца на тваім шляху ў космасе.

**— Лічыцца, што з дапамогай магутных ядзерных энергакрыніц можна рэалізаваць касмічнае пахаванне радыеактыўных адходаў. Наколькі гэта магчыма і ці не рызыкуе чалавецтва забрудзіць і космас?**

— Усе навукоўцы ўпэўнены, што ніводную планету Сонечнай сістэмы нельга выкарыстоўваць як звалку ядзерных адходаў. Для гэтага прыдатныя два месцы: зона астэроідаў паміж Марсам і Юпіцерам, а таксама космас па-за межамі Сонечнай сістэмы. Даставіць адходы ў космас даражэй, чым пакінуць іх на Зямлі. Аднак нават у самым горшым выпадку праз арганізацыю транспартных караблёў электрычнасць падаражэе на 10-15 %. Варта ведаць таксама, што звалкі як такой у космасе не будзе, бо радыеактыўныя рэчывы і так існуюць у міжзоркавай прасторы. Так што мы не забруджваем космас, а проста вяртаем назад хімічныя элементы.

**Гутарыла Ірына СІДАРОК.**

Арбіта інтарэсаў

# Касмічны запас трываласці

**Расія і Беларусь створаць два касмічныя апараты ў рамках міжнароднай дзяржаўнай праграмы «Інтэграваная сістэма дзяржаў — членаў ЕАЭС па вытворчасці і прадастаўленні касмічных і геаінфармацыйных паслуг на аснове нацыянальных крыніц даных дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі». Пра гэта расказаў дырэктар навукова-інжынернага дзяржаўнага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Геаінфармацыйныя сістэмы» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, галоўны канструктар Беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі Сяргей ЗАЛАТЫ.**

— Вышэйшым Еўразійскім эканамічным саветам у снежні 2018 года было падпісана пагадненне па яе (этай праграмы)распрацоўцы. Яна ўжо паступіла ў міністэрствы эканомікі краін-удзельніц для ўзгаднення. Праграму плануецца разгледзець на наступным пасяджэнні Еўразійскай эканамічнай калегіі. Яе рэалізацыя дасць магчымасць атрымліваць увесь неабходны аб'ём касмічных даных у інтарэсах краін ЕАЭС. Тэрміны запуску расійска-беларускіх спадарожнікаў пакуль не вызначаны ў сувязі з няпростай сітуацыяй у свеце, якая склалася. Спадзяёмся, у хуткім часе ўсё вырашыцца.

Беларускі касмічны апарат, які быў запушчаны на арбіту амаль восем гадоў таму, мае тэрмін гарантыі пяць гадоў, аднак працуе дагэтуль. «Рэзервовыя сістэмы спраўныя, запас паліва дастатковы. Пры запуску было сем з паловай кілаграмаў, цяпер ёсць яшчэ пяць кілаграмаў у баках. Маем надзею, што касмічны апарат будзе лётаць яшчэ доўга», — расказаў Сяргей Залаты.

Сёлета НАН Беларусі і расійская дзяржаўная карпарацыя па касмічнай дзейнасці «Раскосмас» падпісалі пагадненне аб пашырэнні арбітальнай групоўкі касмічных апаратаў дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, у якую ўваходзяць Беларускі касмічны апарат і расійскі спадарожнік «Канопус-У». «У найбліжэйшы час яе папоўняць іншыя спадарожнікі, агульная колькасць будзе даведзена да шасці — гэта дазволіць падняць аператыўнасць атрымання інфармацыі», — сказаў Сяргей Залаты.

Праяўляюць цікавасць да касмічнай галіны і ВНУ краіны. Напрыклад, ужо гатовы да запуску другі касмічны апарат Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Першы спадарожнік BSUSat-1 быў паспяхова выведзены на арбіту вышынёй больш за 500 кіламетраў над паверхняй Зямлі — у Кітаі з касмадрома Цзюцюань два гады таму. Ён стаў першым універсітэцкім спадарожнікам у сістэме беларускай адукацыі і трэцім аб'ектам айчыннага паходжання на калязямной арбіце.

— Касмічныя тэхналогіі — лакаматыў для развіцця цэлага шэрагу сумежных галін, — упэўнены **кіраўнік апарата Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пётр ВІЦЯЗЬ.** — Для гэтага мы прыцягваем айчынныя аптычныя прадпрыемствы. Напрыклад, ААТ «Пеленг» актыўна ўключылася ў работу і стварыла апарат, які сёння паспяхова канкурыруе на сусветным рынку. Якасць беларускіх тэхналогій ацаніла і краіна-суседка. Абсталяванне беларускай вытворчасці ў найбліжэйшай будучыні будзе ўстаноўлена яшчэ на шасці расійскіх касмічных апаратах.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# Пацярпелі пры выпальванні сухой расліннасці

**Чатыры чалавекі за суткі атрымалі сур'ёзныя траўмы, паведамляе МНС. Пасля вывучэння ўсіх абставін будзе разглядацца пытанне аб прыцягненні вінаватых у выпальванні сухой расліннасці да адказнасці.**

Так, у 10.36 паступіла паведамленне аб пажары ў вёсцы Крычаватка Дрыбінскага раёна. Пры самастойным тушэнні пажару атрымала апёкі 1-2-й ступеняў (15 працэнтаў паверхні цела) грамадзянка 1960 года нараджэння, пенсіянерка, якая шпіталізавана. У выніку агнём пашкоджаны дачны дом і чатыры надворныя гаспадарчыя пабудовы на трох розных зямельных участках.

У 14.18 стала вядома пра пажар сухой расліннасці каля вёскі Старая Мётча Барысаўскага раёна. Пры самастойным тушэнні атрымаў апёкі 1-2-й ступеняў (35 працэнтаў паверхні цела) грамадзянін 1948 года нараджэння, пенсіянер, які шпіталізаваны.

У 16.36 ратавальнікі атрымалі інфармацыю пра пажар на тэрыторыі могілак у вёсцы Новае Сяло Мсціслаўскага раёна. У выніку пажару атрымаў апёкі 1-4-й ступеняў (7 працэнтаў паверхні цела) грамадзянін 1966 года нараджэння, непрацуючы, які шпіталізаваны.

У 21.58 паступіла паведамленне аб пажары сухой расліннасці ў полі каля вёскі Фядоры Столінскага раёна. У выніку пажару атрымаў апёкі 1-2-й ступеняў (15 працэнтаў паверхні цела) грамадзянін 1989 года нараджэння, непрацуючы, які шпіталізаваны.

Пасля разбору вінаватыя асобы будуць прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці (да 40 базавых велічынь) за выпальванне сухой расліннасці, адсутнасць сталага кантролю за працэсам гарэння і забеспячэння сродкамі тушэння.

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях звяртае ўвагу ўласнікаў зямель на неабходнасць пастаяннага кантролю за станам пажарнай бяспекі на сваёй тэрыторыі і недапушчэнне некантраляванага гарэння травы, смецця, паржышчавых рэшткаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## Больш за 23 мільёны дрэў

### 75 памятных алей

**Міністэрства лясной гаспадаркі падвяло вынікі рэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу — 2020», якая, нагадаем, праходзіла з 28 сакавіка да 4 красавіка. Усяго за сем дзён добраахвотнікі разам з работнікамі лесагаспадарчых устаноў высадзілі больш за 23 мільёны дрэў. Асноўнымі лесаўтваральнымі народамі традыцыйна сталі хвоя, елка і бяроза. Новы лес быў створаны на плошчы 5435,9 гектара. Валанцёры працавалі на 2332 аб'ектах.**

Усяго ў акцыі, па інфармацыі міністэрства, узяло ўдзел больш за 42 тысячы чалавек. Акрамя пасадкі лесу валанцёры займаліся таксама прыборкай смецця і захламленасці (усяго было прыбрана 3437 кубаметраў), рэстаўрыравалі месцы масавага адпачынку (да летняга сезона было падрыхтавана 200 аб'ектаў).

Старт добраахвотнай акцыі, прысвечанай 75-годдзю Вялікай Перамогі і Году малой радзімы, быў дадзены каля мемарыяльнага комплексу «Курган Славы», пасля чаго тут была закладзена памятная алея блакітных елак. У ходзе тыднёвай акцыі памятныя алеі ў гонар 75-годдзя Вялікай Перамогі і герояў вайны з'явіліся ў 75 розных кутках краіны. На месцы кожнай была ўстаноўлена памятная шыльда.

У хуткім часе будуць падведзены вынікі конкурсу сярод устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У кожнай вобласці будуць абраныя самая актыўная школа і самы актыўны клас, якія зрабілі найбольшы ўнёсак у азеляненне краіны. Пераможцаў чакаюць каштоўныя падарункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Сямейны капітал: адкрываюцца новыя рахункі

**За тры месяцы гэтага года для шматдзетных сем'яў было адкрыта 910 дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал» на суму 20,475 мільёна рублёў. Усяго ж па стане на 1 красавіка 2020 года ў праграме «Сямейны капітал» для шматдзетных сем'яў адкрыта 82 125 дэпазітных рахункаў.**

У рамках праграмы «Сямейны капітал» 2020—2024 памер сямейнага капіталу складае 22 500 рублёў, ён прызначаецца шматдзетным сем'ям, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (або ўсыноўлена) з 1 студзеня 2020 года да 31 снежня 2024 года ўключна.

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны нагадваюць, што звярнуцца па прызначэнне сямейнага капіталу можна на працягу 6 месяцаў з дня нараджэння (усынаўлення, удачарэння) трэцяга або наступных дзяцей.

Таксама ў ведамстве праінфармавалі, што па стане на 1 красавіка 2020 года на датэрміновае распараджэнне сямейным капіталам пададзена 11 748 заяў. З іх на мэты паляпшэння жыллёвых умоў — 10 968 (94 %), на атрыманне адукацыі — 462 (4 %), на атрыманне медыцынскіх паслуг — 318 (2 %). Прынята 9651 рашэнне аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу.

Больш за ўсё такіх рашэнняў было прынята ў Брэсцкай вобласці — 2296. У Мінскай вобласці было прынята 1614 рашэнняў, на Гомельшчыне — 1549, у Гродзенскай вобласці — 1253, у Мінску — 1148, у Віцебскай вобласці — 902 і ў Магілёўскай — 889.

**Святлана БУСЬКО.**

## Каб не страціць ні хвіліны...

Гомельская гарадская станцыя хуткай медыцынскай дапамогі тэсціруе мабільную праграму «Геалакацыя пацыентаў і машын хуткай дапамогі». Яна дазваляе ў рэжыме рэальнага часу адсочваць месцазнаходжанне кожнай брыгады. Праект распрацаваў магістрант факультэта матэматыкі і тэхналогій праграмавання ГДУ імя Ф. Скарыны Уладзіслаў Яфіменка пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры вылічальнай матэматыкі і праграмавання Дзмітрыя Кузьмянкова.

— Калі дыспетчар прымае выклік, ён бачыць на Google-карце месцазнаходжанне пацыента і машын хуткай дапамогі з указаннем статусу: вольная, спяшаецца на выклік, ажыццяўляе дастаўку пацыента ў бальніцу. У ходзе тэсціравання медыцынскія работнікі звяртаюцца да нас з прапановамі па ўдасканаленні праграмы, — тлумачыць Дзмітрый Кузьмянкоў.

Актыўна ўкараняюцца ў практыку і праекты «Мабільны расклад», «Турыстычны даведнік па Гомелі». Напярэдадні 90-гадовага юбілею ВНУ студэнты працуюць над сэрвісамі для ўніверсітэцкага музея. У электронным выглядзе можна ўбачыць усю інфармацыю аб музейных экспанатах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

На слыху

Алена БОГДАН:

# «ЧЫМ БОЛЬШ РОБІМ ТЭСТАЎ, ТЫМ БОЛЬШ СТАНОЎЧЫХ ВЫНІКАЎ ВЫЯЎЛЯЕМ»

**У Беларусі з 28 лютага, калі быў выяўлены першы выпадак каранавіруса, зафіксаваны 1981 інфіцыраваны. Дзень таму паведамлялася пра 1486 выпадкаў — прырост за апошнія суткі склаў 495 чалавек. Пераважна гэта кантакты першага і другога ўзроўню. Як правіла, у большасці з іх захворванне працякае ў лёгкай ці сярэдняй форме. У стацыянарах знаходзіцца 1793 пацыенты, у тым ліку 72 маюць патрэбу ў падтрымцы апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх, 169 чалавек паправіліся і выпісаны, 19 памерла. Кіраўніцтва Міністэрства аховы здароўя адказала на самыя актуальныя пытанні аб сітуацыі з распаўсюджваннем COVID-19 у краіне.**

## Абмежаванні на продаж некаторых лекаў

— Памерлых мы ўключаем у статыстыку толькі ў тым выпадку, калі атрымліваем адпаведнае патолагаанатамічнае заключэнне, даведку аб смерці, дзе кадзіроўка праведзена належным чынам, — тлумачыць тактыку **намеснік міністра аховы здароўя Алена БОГДАН.** — Чаму прытрымліваемся такога правіла? У нашай практыцы з'явілася некалькі пацыентаў, у якіх была дыягнаставана каранавірусная інфекцыя, потым у працэсе лячэння вірус з арганізма быў элімінаваны, але былі запушчаны незваротныя працэсы хранічных хвароб. І непасрэдна прычынай смерці не з'яўлялася каранавірусная інфекцыя. Таму мы падыходзім дастаткова жорстка, кожны выпадак аналізуецца профільнай групай спецыялістаў, у тым ліку і для таго, каб мы своечасова ўносілі змены ў клінічныя падыходы да лячэння пацыентаў з той ці іншай хранічнай паталогіяй.

Алена Богдан паведаміла, што ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй унесены змены ў нарматыўныя дакументы, у прыватнасці па аказанні медыцынскай дапамогі цяжарным жанчынам, а таксама дзецям.

— Дзяцей у нас менш за 1 % сярод выяўленых інфіцыраваных, і мы не бачылі нават сярэднецяжкіх выпадкаў, тым не менш парадак прапісалі з моманту нараджэння. Калі дзіця нараджаецца ад інфіцыраванай маці, то яно лічыцца кантактам першага ўзроўню, і за ім устанаўліваецца назіранне цягам 28 дзён, — расказала Алена Богдан.

Што датычыцца цяжарных жанчын, то ўчора стала вядома, што ў сталічнай 3-й гарадской клінічнай бальніцы знаходзяцца пяць цяжарных жанчын з каранавірусам.

— Пагрозы іх жыццю на сёння няма, — пракаментавала Алена Богдан.

Яна паведаміла, што цяпер кантакты першага ўзроўню могуць заставацца на самаізаляцыі дома. Спачатку тэрмін іх шпіталізацыі быў скарочаны да сямі дзён і пасля выпіскі не было ніводнага выпадку ўзнікнення COVID-19. Цяпер такія пацыенты змяшчаюцца пад хатняе назіранне ўчастковай службай з тэсціраваннем на 1-ы, 7-ы і 12-13-ы дні, на гэты час ім будзе выдавацца бальнічны ліст.

Акрамя гэтага, намеснік міністра пракаментавала яшчэ адзін рэзанансны дакумент аб абмежаванні продажу ў аптэках некаторых лекавых сродкаў, антысептыкаў і масак.

— Мы сутыкнуліся з беспрэцэдэнтным выпадкам: за два тыдні з аптэк быў раскуплены 14-месячны запас парацэтамолу. Таму прыняты меры для абмежавання водпуску сродкаў, якія могуць выкарыстоўвацца для лячэння грыпу і іншых рэспіраторных інфекцый.

**Абмежаванні датычацца парацэтамолу і арпетолу (не больш за 40 таблетак у адны рукі), асельтамівіру (не больш за дзве ўпакоўкі), флустопу (не больш за 10 капсул), масак (не больш за 10 штук), антысептыкаў (не больш за дзве ўпакоўкі), пальчатак (не больш за пяць пар).**

## Грошы з дабрачыннага рахунку — на сродкі аховы для медыкаў і тэсты

Намеснік міністра паведаміла, што з 24 сакавіка на дабрачынны рахунак Міністэрства аховы здароўя паступіла 3 937 777 рублёў і 78 461 еўра. Сярод ахвяравальнікаў — 1310 фізічных і 210 юрыдычных асоб. За гэтыя сродкі ўжо набыты чатыры тысячы ахоўных экранаў і сто тысяч ахоўных камбінезонаў для медыкаў, дзве тысячы набораў рэагентаў для выяўлення каранавіруса, 20 тысяч масак. У Віцебскі абласны клінічны спецыялізаваны цэнтр пастаўлена 50 пульсаксіметраў, 10 кіслародных канцэнтратараў, у Барысаўскую бальніцу № 2 — 25 пульсаксіметраў і пяць кіслародных канцэнтратараў. Выдаткавана 334 тысячы рублёў РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі на вытворчасць тэстаў.

Паводле інфармацыі Алены Богдан, на сёння ў Беларусі ёсць 65 880 тэстаў (з улікам 50 тысяч перададзеных на гэтым тыдні). За мінулыя суткі праведзена амаль чатыры тысячы тэстаў.

— Рост колькасці станоўчых вынікаў звязаны з агульным павелічэннем колькасці тэстаў, якія мы робім. Калі мы праводзілі тысячу тэстаў у суткі, было 8-10 % станоўчых вынікаў. Сёння мы робім чатыры тысячы і маем тыя ж 10 % станоўчых, — адзначыла намеснік міністра.

Сёння тэсціруюцца хворыя на пнеўманію ў цяжкай і сярэдняцяжкай форме; грамадзяне, якія прыбылі з-за мяжы; кантакты інфіцыраваных першага ўзроўню, а таксама другога ўзроўню пры наяўнасці ў іх сімптомаў ВРВІ.

У Беларусі створана кругласутачнае медыцынскае тэлекансультаванне. Дзякуючы яму ўрач з цэнтральнай раённай бальніцы можа звязацца з найлепшымі ўрачамі краіны — выкладчыкамі і прафесарамі медуніверсітэтаў, і кафедраў БелМАПА — і атрымаць кансультацыю па канкрэтным пацыенце.

## Рэкамендацыі для святочных набажэнстваў

Беларускіх медыкаў імкнуцца забяспечыць усімі неабходнымі сродкамі аховы. **Намеснік міністра аховы здароўя Барыс АНДРАСЮК** паведаміў, што на сёння ёсць 2,5 мільёна масак, 176 тысяч рэспіратараў, 110 тысяч касцюмаў.

— Не скажу, што гэта шмат, — хацелася б больш. Робім для гэтага ўсё магчымае. У найбліжэйшы час чакаем 15 тысяч аднаразовых камбінезонаў, 400 тысяч масак, якія паступяць у сістэму «Фармацыі». Прыбывае 50 тысяч рэспіратараў 2 і 3 класаў аховы, потым яшчэ 57 тысяч, а на наступным тыдні чакаем 750 тысяч. Што датычыцца праблемы з антысептыкамі, то падключыўся канцэрн «Белдзяржхарчпрам», і цяпер мы пачалі выпрацоўваць больш, чым расходуем. У найбліжэйшы час яны з'явяцца ў аптэчнай сетцы.

Увядзення дадатковых мер з улікам павелічэння колькасці пацыентаў пакуль не плануецца:

— Мы чакалі росту і рыхтавалі сістэму з першых дзён, — растлумачыла Алена Богдан. — І мы пакуль спраўляемся, працуем у рамках нашага першага плана, на другі этап не пераходзілі.

Пры гэтым Міністэрства аховы здароўя парэкамендавала кіраўніцтву праваслаўнай і каталіцкай канфесій арганізаваць максімальна бяспечныя ўмовы для святкавання Вялікадня. Прадстаўнікі царквы пайшлі насустрач: усе святочныя службы будуць транслiравацца па тэлебачанні. Прыхаджанам сталага веку, а таксама людзям з сімптомамі ВРВІ рэкамендуецца заставацца дома.

**Алена КРАВЕЦ.**

Пераарыентацыя

# СТРАЦІЦЬ... КАБ ЗНАЙСЦІ!

**Як жыве сям'я, дзе яна — гаспадыня турыстычнага агенцтва, што працуе з Кітаем, а ён — уладальнік бізнесу па продажы квіткоў? Што робяць яны ў цяперашняй сітуацыі з каранцінам, закрытымі межамі і адменай шматлікіх мерапрыемстваў? «Галоўнае — не сумаваць!» — лічыць Яўгенія Найдовіч.**

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.
При подготовке годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо.
Лица, наделенные руководящими полномочиями, в том числе Аудиторский комитет Банка, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности аудируемого лица.

### Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения.
Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности, принимаемые на ее основе.
В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:
• выявляем и оцениваем риски существенного искажения годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры, в соответствии с оцененными рисками, направленные на снижение этих рисков; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие, таких как сговор, подлог или подделку документов, умышленные пропуски, представление недостоверных сведений или нарушение системы внутреннего контроля;

### Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности (продолжение)

• получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей отношение к аудиту годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;
• оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности;
• оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности, и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
• оцениваем общее представление годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также оцениваем, обеспечивает ли годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.
Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.
Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все этические требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

### Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности (окончание)

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

Заместитель директора по аудиту, Партнер по заданию — Н. В. Ляховченко (свидетельство о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе № 29 от 15.03.2006. Квалификационный аттестат аудитора № 0002605 от 26.08.2003, рег. № 991).

Аудитор, возглавлявший аудит — Е. О. Жизневская (свидетельство о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе № 108 от 22.03.2018. Квалификационный аттестат аудитора № 0002418 от 13.12.2017, рег. № 2159).

Дата аудиторского заключения: 24 марта 2020 года.

Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.

Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 24 марта 2020 года.

Должность, Ф.И.О.
Главный бухгалтер Глазырина О. В. Подпись________

СВЕДЕНИЯ ОБ АУДИТОРЕ:

Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «БДО».
*Место нахождения:* Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 103, 8-й этаж, помещение 7.
*Сведения о государственной регистрации:* Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 15 ноября 2013 года.
*УНП:* 190241132.

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже конфискованного имущества 5 мая 2020 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Капитальное строение с инвентарным номером 412/С-24924 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж) | Гродненская область, Мостовский район, г. Мосты, ул. Кольцевая, 5А/9, блок 7 | 1 728,00 | 172,80 | без условий | Здание гаража общей площадью 18,4 кв. м. Материал стен – кирпич, фундамент – бутовый ленточный, перекрытия – железобетонные, кровля – рубероид, пол – бетонный, ворота – металлические, электричество – открытая проводка. Год постройки – 1991-й. Здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 424050100004000043 площадью 1,6856 га |
| 2* | Капитальное строение с инвентарным номером 412/С-1861 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом) | Гродненская обл., Мостовский район, Дубненский с/с, д. Сухиничи, ул. Стельмаховская, д. 50 | 4 320,00 | 432,00 | без условий | Здание одноквартирного жилого дома с составными частями и принадлежностями: кирпичная холодная пристройка, дощатая веранда, три дощатых и один деревянный сарай, бетонный погреб, дощатая уборная, колодец общей площадью 73,3 кв. м, число жилых комнат – 3. Материал стен – кирпич, перегородки – кирпич, перекрытия – дощатые, крыша – шифер, отопление – печное, освещение – скрытая проводка. Год постройки – н/у. Здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 424081705601000050 площадью 0,0639 га (право пожизненного наследуемого владения) |
| 3* | Капитальное строение с инвентарным номером 412/С-25038 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом) | Гродненская область, Мостовский район, Куриловичский с/с, д. Стукалы, ул. Кольцевая, д. 4 | 1 987,20 | 198,72 | без условий | Здание одноквартирного жилого дома общей площадью 85,3 кв. м с составными частями и принадлежностями: пристройка, 4 сарая, навес, колодец, калитка, забор. Материал стен – брус, перекрытия – деревянные, крыша – шифер. Год постройки – 1963-й. Здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 424082308701000045 общей площадью 0,2500 га |
| 4* | Капитальное строение с инвентарным номером 442/С-1860 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – павильон рынка) | Гродненская область, Островецкий район, Михалишковский с/с, д. Михалишки | 11 404,80 | 1 140,48 | без условий | Одноэтажное здание общей площадью 477,6 кв. м. Материал стен – блочно-кирпичные. Год постройки – 1989-й. Здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 424682315101000070 общей площадью 1,0900 га. |
| 5* | Земельный участок с кадастровым номером 422084000019000028 | Гродненская область, Гродненский район, Квасовский сельсовет, СТ Гарант, д. 348 | 2 430,00 | 243,00 | без условий | Общая площадь – 0,0800 га. Назначение – земельный участок для коллективного садоводства, не огорожен, капитальных строений и сооружений нет, форма участка прямоугольная |

* – Лот продается по поручению управления и межрайонных отделов по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, тел.: (0152) 720537, 720010.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** Доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо:** Паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Аукцион состоится 5 мая 2020 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 9 апреля по 30 апреля 2020 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720537, 720010.

Адрес сайтов: **www.grodno.gov.by, gcn.by**

## Информация об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Полесьежилстрой» за 2019 г.

обеспеченность акции имуществом, руб.: 256,47

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | *108650,00* | *90142,00* |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | *101585,00* | *83112,00* |
| Прибыль (убыток) до налогообложения, всего (прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | *6400,00* | *7746,00* |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | *7062,00* | *7030,00* |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | *-477,00* | *780,00* |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | *-188,00* | *-64,00* |
| Налог на прибыль | тысяч рублей | *1468,00* | *1798,00* |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | *4932,00* | *5948,00* |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | *7512,00* | *7794,00* |

Доля государства в уставном фонде эмитента – 0%. Количество акционеров – 846, в т.ч. юр. лиц – 8, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0, физ. лиц – 838, из них нерезидентов Республики Беларусь – 1. Выплата дивидендов за 2019 г. не производится.

Среднесписочная численность работающих (человек): 1 557.

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20 и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): подрядные работы.

Дата проведения годового общего собрания акционеров: 27.03.2019 г.

Аудиторское заключение от 25.03.2020 г. ИП Ульчик Валерий Константинович, Жабинковский район, д. Бусни, ул. Колхозная, 54. Свидетельство № 290244551 выдано Жабинковским районным исполнительным комитетом 01.08.2013 г. за 2019 год. Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности: «Годовая бухгалтерская отчетность ОАО «Полесьежилстрой», подготовленная в соответствии с законодательством РБ, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Полесьежилстрой» на 31.12.2019 г., а также финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на эту дату, в соответствии с законодательством РБ».

Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг утвержден внеочередным общим собранием акционеров (протокол № 120 от 20.06.2019 г.), Положение об учете аффилированных лиц (новая редакция), утверждено внеочередным общим собранием акционеров (протокол № 120 от 20.06.2019 г.).

Адрес сайта ОАО «Полесьежилстрой»: pzs.by

УНП 200050191

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 13 (501)

Выстава

# Карціны-падушкі, Брэжнеў у ФРГ і «Крытыка чыстага розуму»

## Адна з найлепшых выстаў апошняга часу стала даступная ў фармаце 3D-тура

**Распаўсюджанне COVID-19 унесла свае карэктывы ў нашае культурнае жыццё: мы сталі глядзець кіно выключна на дамашнім экране, «хадзіць» у тэатры праз трансляцыі і відэазапісы, набываць кнігі ў інтэрнэт-кнігарнях з дастаўкай. Цяпер мы можам упісаць у свой графік і «наведанне» сталічнага Палаца мастацтва, дзе ўжо з месяц размешчана маштабная выстава «Шляхі нямецкага мастацтва з 1949 года па сённяшні дзень». Праект, што каля двух гадоў рыхтаваўся быць прэзентаваным у Мінску, адкрыўся ў даволі нязручны час: усё ж арыгіналы Ёзэфа Бойса, Бернда і Хілы Бехер альбо К. О. Гёца вартыя не абмежаванай кавідам публікі. Але арганізатары хутка падладзіліся пад умовы і дапоўнілі рэальную экспазіцыю 3D-турам, у які можна адправіцца на сайце Гётэ-інстытута ў Мінску.**

Праект «Шляхі нямецкага мастацтва» выключны і з пункту гледжання каштоўнасці экспанатаў, і з пункту гледжання мастацкай насычанасці, і з пункту гледжання куратарскага падыходу. Ідэя выставы, сабранай Маціясам Флюге і Маціясам Вінцэнам, — паказаць развіццё мастацтва ФРГ і ГДР, не раздзяляючы іх сцяной, на роўных, ды яшчэ і ў храналагічным парадку.

«Упершыню надарылася магчымасць выбудаваць новы наратыў пра дзве гісторыі нямецкага мастацтва, якія чатыры дзесяцігоддзі працякалі паралельна», — пішуць куратары ў сваім суправаджальным слове. — Гэтая выстава працуе з незвычайнымі і павучальнымі супрацьпастаўленнямі розных мастацкіх спосабаў выказвання, то параўноўваючы Усход і Захад, то сутыкаючы супрацьлегласці на ўзроўні індывідаў».

Экспазіцыя ўключае ў сябе каля чатырохсот работ больш чым ста аўтараў з фонда Інстытута сувязяў з замежнымі краінамі ў Штутгарце — хоць нейкім чынам, але да яе варта прычыніцца, нават калі гэта будзе выпісванне некалькіх імён і вывучэнне іх даволі займальнага ўнёску самастойна.

Інстытут, які ў цэлым валодае прыблізна 29 тысячамі твораў мастацтва, існуе яшчэ з 1917 года, але новы віток свайго развіцця атрымаў у 1949-м, калі была створана Федэратыўная Рэспубліка Германія, што займела патрэбу ў добрым іміджы. Інстытут стаў збіраць калекцыю, а пасля падзення Берлінскай сцяны ў 1990 годзе ўвабраў у сябе таксама фонды цэнтра мастацкіх выстаў ГДР. Урэшце гэта дазволіла стварыць экспазіцыю «Шляхі нямецкага мастацтва», здольную рэпрэзентаваць тэмы, віды і тэндэнцыі, што пачынаючы з 1949 года мелі месца ў мастацтве як Заходняй, так і Усходняй Германіі.

Экспазіцыя ўключае ў сябе жывапіс, графіку, фатаграфію, скульптуру, інсталяцыю, відэаарт. Трэба разумець, што ўсё гэта адлюстроўвае часы, калі дванаццацігадовае панаванне Нацыянал-сацыялістычнай нямецкай рабочай партыі, што ўспрымала культуру сваім натуральным інструментам і мела да яе канкрэтныя патрабаванні, засталося ў мінулым. То-бок у часы, калі




«Я не ведаю выхадных» Ёзафа Бойса (1972). Кніга — «Крытыка чыстага розуму» Імануіла Канта.



«Хлопчык з рэвальверам, Дзюсельдорф» Андрэ Гельпке (1986).

стаўленне да мастацтва на тэрыторыі Германіі памянялася, а магчымасці творцаў пашырыліся. У сферы апынуліся тыя, хто ў свой час добраахвотнікам пайшоў на вайну; тыя, чые творы трапілі пад абразлівае азначэнне «дэгенератыўнага мастацтва», што нацысцкімі ідэолагамі прапагандавалася як небяспечнае; тыя, хто нарадзіўся ўжо пасля Другой сусветнай вайны.

І трэба сказаць, творчае жыццё закіпела, што выстава ў Мінску цудоўна дэманструе — тут вы ўбачыце, напрыклад, нямецкі поп-арт, авангардную плынь «Флюксус» (а немец Ёзаф Бойс быў адным з найярчэйшых яго прадстаўнікоў), дзіўны інфармель у выкананні К. О. Гёца альбо Эміля Шумахера.

Таксама вялізны пласт аўтарскай фатаграфіі, у тым ліку легендарных Бернда і Хілы Бехер, якія рабілі чорна-белыя здымкі буйных прамысловых забудоў (кажуць, 95 працэнтаў гэтых збудаванняў не захавалася). Альбо Барбары Клем, аўтаркі вядомага здымка сустрэчы Леаніда Брэжнева і Вілі Бранта ў Боне падчас першага дзяржаўнага візіту савецкага лідара ў ФРГ у 1973 годзе. Альбо Андрэ Гельпке, які ў сваёй чорна-белай фатаграфіі адлюстроўваў аўтсайдараў і як бы штодзённае жыццё.

Што да Ёзэфа Бойса, то ўжо толькі дзеля яго аднаго можна пайсці ў тур па выставе: «Бойс лічыцца адным з найважнейшых пратаганістаў сучаснага мастацтва XX стагоддзя, які прычыніўся да радыкальных змен у мастацтве пасляваеннага перыяду як мастак, тэарэтык і прафесар Дзюсельдорфскай акадэміі мастацтваў». Спадар Гёц з'яўляецца адным з найважнейшых прадстаўнікоў інфармелю і жывапісу дзеяння. Фрыц Фінтэр — завадатар нямецкага абстрактнага мастацтва і адзін з заснавальнікаў групы «Дзэн 49». Вольф Фостэль распрацаваў аўтарскую канцэпцыю дэкалажу, якім намагаўся справакаваць крытычнае стаўленне да тавараў і СМІ. Готхард Граўбнер вывучаў колер і ў некалькі слаёў наносіў фарбу на палатно, нацягнутае на пласт сінтэтычнай ваты — атрымліваліся карціны-падушкі з найтанчэйшымі колеравымі нюансамі. І гэтак далей, і гэтак далей.

«Шляхі нямецкага мастацтва» паказваюць не толькі розныя тэхнікі, віды і эстэтыкі, але і тэндэнцыі — як у 1950-х гадах стала расці значэнне фатаграфіі, а пачынаючы з 1970-х пра сябе сталі заяўляць жаночае мастацтва і феміністычная тэматыка (калі ласка — Ульрыке Розенбах, Рэбека Хорн, Крысціяне Мёбус, Катарына Фрыч, Розэмары Трокель).

Выстава ў Мінску, арганізаваная сумесна Гётэ-інстытутам у Беларусі, штутгарцкім Інстытутам сувязяў з замежнымі краінамі і Палацам мастацтва, была падрыхтавана як частка Тыдняў Германіі. У якасці 3D-тура экспазіцыя будзе працаваць да 30 красавіка.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**

Дзеля памяці

# Памёр мастак з беларускімі каранямі Анджэй Струміла

**«Польскі Леанарда» Анджэй Струміла, які лічыў Беларусь сваёй радзімай, а сябе — грамадзянінам ВКЛ, 10 красавіка пайшоў з жыцця.**



Кадр з фільма Summa.

Мастаку было 93, апошнія гады ён правёў у прыватным доме на беразе ракі ў польскіх Сувалках, на польска-беларускім памежжы, дзе трымаў коней і да апошняга займаўся творчасцю. Калі ён дрэнна сябе адчуў, быў шпіталізаваны, але ўрэшце памёр.

Вядомы мастак і скульптар мае беларускія карані: яго бацька і дзед паходзілі з Мінска. Сам спадар Анджэй нарадзіўся ў Вільнюсе ў 1928 годзе. Ён жыў у Літве, Беларусі, а адукацыю атрымаў у Польшчы, дзе і правёў большую частку свайго жыцця.

Творчая біяграфія мастака ўключае ў сябе персанальныя выставы па ўсім свеце, у тым ліку некалькі ў Беларусі, якую ён называў сваёй Бацькаўшчынай.

З беларускай культурай Анджэя Струмілу звязвае таксама дакументальная карціна Summa, якую рэжысёр Андрэй Куціла здымаў у Сувалках на працягу некалькіх гадоў і дзе заспеў апошнія гады жыцця мастака. Гэта першы беларускі фільм, які атрымаў галоўны прыз у сваёй катэгорыі на «дакументальных Канах» — кінафестывалі IDFA ў Амстэрдаме. Больш за тое, гісторыя стужкі адлюстроўвае яшчэ адну глыбокую повязь мастака з Беларуссю — сяброўства з мінчанкай Марыяй, якая час ад часу наведвала Струмілу ў Сувалках.

Цяпер карціна з'яўляецца тым больш каштоўным дакументам, што захоўвае асобную энергетыку, якая панавала ва ўладаннях Струмілы.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**

У самаізаляцыі

# Глядзім грузінскую драму, супраць якой пратэставалі самі грузіны

**Ён выклікаў фурор на Канскім кінафестывалі, справакаваў скандал і пратэсты ў Грузіі і стаў адным з самых чаканых фільмаў у праграме мінулага кінафестывалю «Лістапад». Для тых, хто не паспеў убачыць «А потым мы танцавалі» шведскага грузіна Левана Акіна, карціна стала даступная ў сеціве.**

«У грузінскім танцы геяў няма», — сказалі ў Грузіі, калі Леван Акін стаў працаваць над здымкамі, і пайшлі ў наступленне. Ужо на этапе стварэння фільма здымачная група сустрэлася з пэўнымі перапонамі і ў адказ на пагрозы мусіла наймаць целаахоўнікаў і хаваць імёны датычных да праекта. Нягледзячы на тое што ў свой час «А потым мы танцавалі» быў, напэўна, самым гучным грузінскім фільмам на міжнароднай прасторы (грузінскім паводле тэматыкі, месца здымак, месца дзеяння, нацыянальнасці рэжысёра і акцёраў, да вытворчасці ж далучаюцца Швецыя і Францыя), у самой Грузіі яго назва суправаджалася непрыманнем, скандаламі, а ўрэшце масавымі пратэстамі.

У дзень прэм'еры ў Тбілісі каля аднаго з пяці кінатэатраў «Амірані», дзе мусіў адбыцца паказ, ультраартадоксы сабраліся на акцыю пратэсту з малітвамі, «каб Бог захаваў Грузію ад садомскага граху», і намерам прарвацца ў залу і сарваць прэм'еру фільма. Каля кінатэатраў з самай раніцы стаялі кардоны паліцыі і спецназа, пратэстоўцы, сярод якіх былі і святары, паводзілі сябе агрэсіўна, некаторыя гледачы з білетамі не змаглі трапіць на паказ, адзінаццаць чалавек былі затрыманы, а прэм'ера тым часам прайшла з аншлагам.

Леван Акін расказвае вельмі прыгожую, кранальную і пластычную гісторыю Мераба — так бы мовіць, ментальнага аўтсайдара, які адчувае сваю адрознасць ад іншых, але, здаецца, сам не разумее, у чым яна заключаецца. Пакуль у ансамблі, дзе ён танцуе і мае свае амбіцыі, не з'яўляецца новы чалавек і, дарэчы, канкурэнт Іраклій. Пасля позіркаў, сустрэч і целарухаў Мераб як бы знаходзіць сваю ідэнтычнасць, але аказваецца, што яна непрыдатная да існуючага атачэння і нават жыцця ў Грузіі. На кінафестывалі «Лістапад» у Мінску выканальнік галоўнай ролі Леван Гелбахіяні, між іншым, атрымаў прыз за найлепшую мужчынскую ролю.

«А потым мы танцавалі» — не драма людзей, што не могуць быць разам, якую можна чакаць пасля сінопсіса і перадгісторыі, і ўвогуле фільм не пра двух. Карціна стварае шматмерны знешні і ўнутраны свет галоўнага героя Мераба і становіцца ўважлівым іх даследчыкам — праз іх каларыт, кантрасты і эмацыянальнасць ва ўсім, што адбываецца, можна лёгка забыцца. Тут важная кожная дэталь атачэння — прыгатаваная бабуляй вячэра і доўг за электраэнергію, разбэшчаны брат, праца афіцыянтам па вечарах, апантанасць танцамі, мімалётныя папрокі суседкі, цыгарэты з Лондана ад дзяўчыны і гэтак далей.



Але «фішка» карціны не толькі ў складна прапісаным сюжэце і шматлікасці ні разу не лішніх дэталяў палатна, а ў тым, як шмат рэжысёр кажа паміж радкамі, як незаўважна перадае намёкі, думкі і настроі, як пяшчотна прыводзіць да асабістай драмы і якім дасціпным сродкам выразнасці становіцца танец. Гэта адначасова відавочныя і неспасціжныя хвалі, пад уздзеяннем якіх прыемна знаходзіцца, пакуль не прыходзіць адна з самых бліскучых кінаканцовак апошняга часу.

«А потым мы танцавалі» прадстаўляе эфектны мікс грузінскай эмацыянальнасці — усіх гэтых выбрыкаў з закідваннем рукі і пагрозлівымі словамі (хто ведае, як гучыць грузінская мова, разумее), з унутранай чуллівасцю Мераба. Нездарма гісторыя адбываецца з выканаўцам грузінскіх танцаў, дзе мужчынскую частку прадстаўляюць апрыёры маскулінныя тыпажы, нездарма ў самым пачатку фільма чуецца заўвага настаўніка пра мяккасць Мераба і нездарма ў Грузіі карціну пракаментавалі словамі «У грузінскім танцы геяў няма».

Ёсць ці няма, але грузінскія ўльтраправыя, пэўна, не ведалі, што сваёй рэакцыяй на фільм, які нават не бачылі, пацвярджаюць абгрунтаванасць драмы ў «А потым мы танцавалі», заснаванай не столькі на стасунках з каханым, колькі на адчуванні сябе, такога, як ёсць, лішнім на гэтым грузінскім свяце жыцця.

У пачатку карціны гаворка заходзіць пра адбор танцораў у прэстыжны нацыянальны ансамбль. Можна было падумаць, што аўтары давядуць гэта да саперніцтва паміж галоўнымі героямі за месца пад сонцам, але рэжысёр абыграў конкурс куды больш выкшталцоным і тонкім чынам — урэшце Мераб прыходзіць на пробу і робіць карціну «А потым мы танцавалі» незабыўнай.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**

Культасвета

# #Гаворыць і паказвае Мінск

**15 красавіка, у Сусветны дзень мастацтва, відэасэрвіс VOKA правядзе анлайн-экскурсію па выстаўцы Лазара Хідэкеля «Нас зразумеюць праз 100 гадоў». Усе ахвотныя, знаходзячыся ў любым месцы свету, з дапамогай загадчыцы аддзела сучаснага беларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Кацярыны Ізафатавай змогуць цалкам бясплатна ўбачыць творы і даведацца пра жыццёвы шлях знакамітага мастака — першага ў свеце супрэматычнага архітэктара, які апярэдзіў час амаль на стагоддзе, аднаго з заснавальнікаў творчай суполкі «УНОВІС» і «бацькі» вядомага сёння значка хэштэга #.**

Дарэчы, спецыяльна для першай персанальнай выстаўкі Лазара Хідэкеля ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі з Нью-Ёрка ў Мінск былі дастаўленыя каля 100 арыгінальных работ з архіваў сям'і мастака: эскізы касмічнага жытла, планы «Горада-саду», «Аэрагорада» і «Аквагорада», першы архітэктурны экалагічны маніфест «АЭРА» і іншыя.

Экскурсія, прымеркаваная да закрыцця выстаўкі пачнецца а 19-й гадзіне і будзе дасяжная ў мабільнай праграме VOKA альбо на сайце voka.tv з любой прылады. Акрамя таго, да канца года на сэрвісе можна бясплатна паглядзець дакументальны фільм Яўгена Сяцько «УНОВІС» пра гісторыю творчага аб'яднання. Анлайн-імпрэзы — часткі маштабнага праекта #UNOVIS100, які рэалізуюць сумесна Цэнтр беларуска-яўрэйскай культурнай спадчыны, Музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча і кампанія А1 пад патранатам Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА ў Беларусі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тэатр

# ЧАРАЎНІКІ ЗАКУЛІССЯ

**Паводле адной з тэатральных баек, аднойчы нейкая прыма заявіла рэжысёру, што выйдзе на сцэну, толькі калі брыльянты на ёй будуць сапраўдныя. «Усё будзе сапраўднае, — запэўніў рэжысёр, — і брыльянты ў першай дзеі, і атрута ў апошняй»... Карэспандэнты «Звязды» зазірнулі ў закулісны свет Беларускага акадэмічнага музычнага тэатра, які сталічныя жыхары па старой завядзёнцы завуць «музкамедыяй», — туды, дзе нараджаюцца ідэі, макеты, касцюмы, рэквізіт ды іншыя неад'емныя часткі будучых пастановак.**



Закулiссе тэатра — нібыта іншы сусвет. Ці, сама меней, музей, дзе захоўваюцца рэчы з розных эпох і краін. У кішэні сцэны ў адным кутку дзявочая постаць — статуя ў антычным стылі, надмагільны помнік, кандэлябры, у другім — упрыгожаная кветкамі альтанка і некалькі коней, у якіх ёсць галава і тулава, а ногі кудысьці сышлі. Крыху далей, за невядома чыім тронам, шчарбата ўсміхаецца зусім нястрашны шкілет, які, расказваюць дэкаратары, з дапамогай акцёраў зухавата «аддае гонар». А побач — практычна гатовая венецыянская гандола... на колах. Каркас, абцягнуты тканінай, каб пазбегчы стрэмак у выканаўцаў і падоўжыць тэрмін дзеяння дэкарацый, на нашых вачах становіцца «драўлянай». Усе гэтыя рэчы ў свой час аказваюцца на сцэне і аздабляюць спектаклі розных жанраў.

...З глядзельнай залы назіраем, як на сцэне паўстае Венецыя — аркі, балконы, ажурныя мосцікі, гандолы... Мастак па святле падбірае патрэбныя фільтры і камандуе памочніку: «Гэты цікавы, пакінь, гэты таксама, а гэты — не, адстой, прыбяры і схавай, каб ніхто не бачыў». У пражэктары адцення халоднага месяцовага святла асабліва таямнічымі здаюцца вялізныя, амаль у чалавечы рост, карнавальныя маскі, якія хутка будуць лунаць у паветры.

— Гэта што, вось калі ў нас проста на падлозе будзе вада, атрымаецца яшчэ прыгажэй», — на хвіліну адрываецца ад работы Андрэй Меранкоў, галоўны мастак Музычнага. — Паколькі ў цэнтры падзей — каханне, то ў нас асноўны вобраз — масты, якія могуць злучацца і раз'язджацца, да таго ж святло дазволіць маляваць на светла-шэрых, амаль белых дэкарацыях усякія цуды...

«Мне цікава рабіць спектакль роўна да таго моманту, як яго ўбачыць глядач, — прызнаецца мастак-пастаноўшчык, — потым ужо нічога не пераробіш, і толькі публіка вырашае, атрымалася ў цябе або не. Але галоўнае, што ў нас усе працуюць шчыра, сумленна, ніхто не халтурыць — калі і каманда, і цэхі дзейнічаюць як зладжаны арганізм, працаваць — адно задавальненне.



Мне ёсць з чым параўноўваць, бо я рабіў спектаклі практычна ва ўсіх вядучых тэатрах і магу засведчыць: у музычным тэатры жывапісна-бутафорскі, сталярны, іншыя цэхі — найлепшыя з усіх».

Канешне, пагаджаецца Андрэй Меранкоў, пасля кожнага здадзенага спектакля бывае «дэпрэсія дасягнення», калі нават ад добра зробленай работы адчуваеш не задавальненне, а пустэчу. Але справа ў тым, што ў тэатральным імклівым жыцці няма часу на рэфлексіі, і за адной пастаноўкай тут жа ідзе наступная. А калі трэба аднавіць моцна патрачаную творчую энергію, ратуе жывапіс. Таму ўсе спектаклі, пастаўленыя ў Музычным тэатры, для яго, як дзеці, па-свойму родныя і любімыя. Бо, зноў жа, крэда — працаваць сумленна. А яшчэ мысліць, як вучыў настаўнік — Барыс Герлаван. «У нас, яго вучняў, дэкарацыі разумныя. Бо дэкарацыя — як жанчына, мусіць не толькі быць прыгожай, але і пра нешта гаварыць. Тым больш цяпер час іншы — патрэбная дынаміка, крэатыў, неабходна зацікавіць гледача і ўтрымаць увагу, каб ён не засынаў на дзясятай хвіліне класічнага спектакля».

Нібыта ілюструючы ўласную пазіцыю, мастак бярэ ў рукі шрубакрут і дапамагае «галоўным людзям у тэатры» сабраць частку моста, каб той не праваліўся ў самы адказны момант. А кіраўнік жывапісна-бутафорскага цэха Тамара Жэран вядзе нас далей у закулісныя нетры, дзе таксама віруе работа. Вось бутафоры падкладваюць у распісную міску кавалачкі «мяса» і «памідоры».



— Гэта наш кухар. Што «гатуе»? Збольшага — парэзаны на кавалачкі пенапласт, — смяюцца работнікі цэха, — але выглядаць мусіць так, каб у гледачоў з чацвёртага рада слінкі пацяклі, а з дзясятага — каб пабеглі ў антракце ў буфет!

На стале, бы ў моднай краме, раскладзеныя яркія капелюшы. Усе ручной работы, таксама як і веееры, да якіх адна з дзяўчат цяпер прышывае пышныя карункі, а другая наносіць малюнкі. «Хадземце, пакажу, якія ў нас карнавальныя маскі!» —Тамара Уладзіміраўна дэманструе, якім прыгожым ва ўмелых руках можа атрымацца спалучэнне пап'е-машэ, тканіны і фарбаў.

Кулісы ўжо гатовыя і размешчаныя на сцэне, цяпер чарга за калонамі — хлопцы пераносяць іх уніз, нібы бярвёны на суботніку. У цэху на суседніх крэслах мірна суіснуюць стравы для вячэры ў доме заможнага купца — рыбіна з лімонам і зяленівам на падносе (таксама пенапласт, але каб гэта зразумець, даводзіцца ледзь не абнюхаць рыбіну), антычныя (насамрэч — фанерныя) слупы з капітэлямі і рыцарскі даспех, які вянчае шлем са страусавым пер'ем (пер'е сапраўднае, шлем — каркас, паралон, тканіна і шызасталёвыя фарбы, што з трох крокаў ствараюць поўнае ўражанне металу). Штосьці з гэтага рэквізіту будзе выкарыстана ў найбліжэйшы час, штосьці яшчэ чакае сваіх пастановак — напрыклад, адкладзенага праз каранавірус балета «Праметэй».

Мастакі і бутафоры кажуць, што ў тэатры для іх няма простай ці складанай работы — ва ўсім патрэбныя майстэрства і фантазія: «Гледачы гэтага працэсу не бачаць, а нам здаецца, тут адбываецца самае цікавае». Нам — таксама. А публіцы ў зале даводзіцца толькі здагадвацца, што ў спектаклі — бутафорыя, а што сапраўдныя рэчы, якім закулісныя ўмельцы надалі новае жыццё.

...Апошнім часам, калі праз каранавірус адмяняюцца або пераносяцца на няпэўны тэрмін многія відовішчныя мерапрыемствы, тэатры, у тым ліку беларускія, падтрымліваюць сувязь з публікай дыстанцыйна і выкладваюць частку пастановак на YouTube-каналы. У Музычным таксама не выключаюць такі варыянт.

...Учора тут далі апошняе красавіцкае прадстаўленне. Ад сёння і па 10 мая ўсе спектаклі адмененыя, квіткі на іх можна здаць у касу не пазней за дату, калі мусіў адбыцца спектакль.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

# ПАСЛЯ ПАНДЭМІІ

## ЯК КАРАНАВІРУС ЗМЕНІЦЬ СВЕТ?

**Днямі колішні дзяржсакратар ЗША і савецнік па нацыянальнай бяспецы Генры Кісінджэр у сваім артыкуле для The Wall Street Journal заявіў, што пандэмія каранавіруса назаўжды зменіць сусветны парадак. «Краіны гуртуюцца і квітнеюць дзякуючы ўпэўненасці ў тым, што іх інстытуты могуць прадбачыць бедствы, спыняць іх наступствы і аднаўляць стабільнасць. Калі скончыцца пандэмія COVID-19, інстытуты многіх краін будуць успрымацца як тыя, хто пацярпеў няўдачу. Рэальнасць такая, што пасля каранавіруса свет ніколі не будзе ранейшым», — заўважыў аўтарытэтны палітык. На яго думку, антыкрызісныя намаганні, якія б маштабныя і неабходныя яны ні былі, не павінны выцясняць надзённую задачу аднаўлення для пераходу да посткаранавіруснага парадку. Як пандэмія змяніла свет?**



### УРАД ПЛАНЕТЫ

Сусветныя аналітыкі палічылі (прыблізна, вядома) магчымыя фінансавыя страты ад пандэміі. Ацэнкі адрозніваюцца значна. Эканамісты найбуйнейшых банкаў з Уол-стрыт сыходзяцца ў меркаванні, што глабальная эканоміка цягам двух наступных гадоў не далічыцца астранамічнай сумы з дванаццацю нулямі — больш за пяць трыльёнаў долараў. Каранавірус COVID-19 адабраў у планеты столькі ж сродкаў, колькі вырабляе ў год трэцяя эканоміка свету — Японія, адзначае expert.ru.

Планета імкліва апускаецца ў глыбокую рэцэсію. Яна абяцае быць нядоўгай, але для таго, каб аднавіцца, эканомікам спатрэбіцца значны час. Нягледзячы на беспрэцэдэнтныя праграмы падтрымкі, якія вылічваюцца трыльёнамі долараў, ВУП планеты не вернецца да дакрызіснага ўзроўню раней за 2022 год.

Эканамісты JPMorgan Chase & Co., напрыклад, лічаць, што глабальная эканоміка не далічыцца да канца наступнага года 5,5 трыльёна долараў, або амаль восем працэнтаў ВУП планеты. Кошт пандэміі для развітых эканомік будзе супастаўны са стратамі пасля рэцэсій 1974-1975 і 2008-2009 гадоў.

На думку эканамістаў Morgan Stanley, развітыя рынкі вернуцца да дакрызіснага ўзроўню толькі ў трэцім квартале наступнага года. У Deutsche Bank AG лічаць, што наступствы пандэміі нанясуць толькі эканомікам ЗША і Еўрасаюза да канца 2021-га шкоду на адзін трыльён долараў.

Сусветная гандлёвая арганізацыя звяртае ўвагу на тое, што пандэмія справакуе калапс сусветнага гандлю, маштабы якога перавысяць усё, што было пасля Другой сусветнай вайны. МВФ на наступным тыдні апублікуе свой прагноз. Не трэба быць празорцам, каб прадказаць, што ён будзе вельмі змрочны.

Варта памятаць і тое, што голыя лічбы не раскрываюць той гіганцкай цаны, якую будзе вымушана заплаціць за цяперашні крызіс чалавецтва. Лік ахвярам эпідэміі ідзе ўжо на сотні тысяч. Кампаніі губляюць прыбыткі, шмат каму з іх давядзецца зачыніцца. Па звестках Міжнароднай арганізацыі працы (ILO), работу ў выніку пандэміі рызыкуюць страціць больш аднаго мільярда чалавек.

«Так, вядома, усё гэта будзе мець часовы характар, — пагаджаецца дырэктар Blackstone Group Inc. Стыў Шварцман. — Але сітуацыя будзе ціснуць на ўсё». Урадам розных краін абавязкова давядзецца супрацоўнічаць і каардынаваць свае дзеянні. Банк міжнародных разлікаў (BIS) папярэдзіў, што разрозненыя намаганні могуць справакаваць другую хвалю пандэміі, пасля якой ВУП планеты не далічыцца ўжо 12 працэнтаў ад узроўню канца 2020 года.

Без скаардынаваных дзеянняў рынкі, якія развіваюцца, будуць аднаўляцца вельмі доўга, упэўнены кіраўнік аддзела даследавання State Street Global Advisors Амлан Рой. Ён лічыць, што калі кожная краіна будзе дзейнічаць у адзіночку, то аднаўленне расцягнецца як мінімум на пяць—дзесяць гадоў.

Былы прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Гордан Браўн заклікаў стварыць сусветны ўрад для барацьбы з пандэміяй. Пра гэта паведамляе выданне The Guardian. На думку Браўна, сусветным лідарам варта стварыць часовую форму глабальнага ўрада з удзелам экспертаў у галіне аховы здароўя і кіраўнікоў міжнародных арганізацый для барацьбы з падвойным, медыцынскім і эканамічным, крызісам.

Наступствы пры ўсіх сцэнарыях развіцця падзей будуць адчувацца яшчэ вельмі доўга. Паводле даследавання эканамістаў універсітэта Каліфорніі, гаворка ідзе не пра гады, а пра дзесяцігоддзі. Галоўны эканаміст Berenberg Хольгер Шмідынг адзначае, што ўлады, хутчэй за ўсё, будуць вымушаны захоўваць вельмі сур'ёзныя абмежаванні на вандроўкі і паездкі да 2021 года, каб выключыць магчымасць вяртання каранавіруса. У той жа самы час відавочна, што выдаткі на аднаўленне акажуцца значна большымі, чым лічылася раней. Гэта значыць, што чалавецтву давядзецца запасацца цярпеннем і змірыцца са стратай трыльёнаў долараў.

### НАЙБУЙНЕЙШЫ ПЕРАДЗЕЛ

Пасля завяршэння пандэміі каранавіруса свет апынецца на парозе найбуйнейшага за пасляваенную гісторыю перадзелу ўласнасці, заўважае Forbes. Наяўнасць новых юрыдычных тэхналогій, адпрацаваных на крызісе 2008-га і вывастраных за апошняе дзесяцігоддзе, гарантуе, што гэты працэс будзе дынамічны і агрэсіўны. Выгаду з віруснага крызісу атрымаюць тыя, хто танна купіць стратэгічныя для свайго бізнесу або проста прывабныя актывы.

Многія гульцы фінансавага рынку прадбачылі глабальны калапс. Праўда, асноўнага ўдару чакалі ўсё ж не вясной, а пасля амерыканскіх выбараў у кастрычніку. Паказальна, што некалькі найбуйнейшых фондавых кіраўнікоў прынялі ў пачатку 2020 года рашэнне максімальна выйсці ў кэш — нават у шкоду бягучай даходнасці сваіх фондаў. Так, напрыклад, агульная сума актываў у Templeton Global Bond складала $39,8 млрд, а працэнт актываў у наяўных на люты 2020-га — 31,22%, у First Eagle Global — $57 млрд і 19,8 % адпаведна, у Invesco Diversified Dividend — $23,8 млрд і 15,74 %.

Фонды прамых інвестыцый наогул унікальна падрыхтаваліся да крызісу. Паводле звестак агенцтва Preqin, на канец мінулага года актывы такіх фондаў уключалі рэкордны за ўсю гісторыю аб'ём кэшу: $1,45 трлн.

Не ўсе краіны рады таму, што іх стратэгічныя актывы, якія праселі ў крызіс, набудуць невядомыя замежныя пакупнікі. У 2018 годзе ў ЗША быў прыняты закон (Foreign Investment Risk Review Modernization Act), які значна ўзмацняе кантроль не толькі за ўкладаннямі ў крытычныя аб'екты нацыянальнай інфраструктуры, але і за інвестыцыямі, якія даюць доступ да «непублічнай тэхнічнай інфармацыі», што можа ўключаць амаль любую карпарацыю, звязаную з перадавымі тэхналогіямі.

Еўрапейскі Саюз летась прыняў аналагічнае заканадаўства (Regulation (EU) 2019/452), згодна з якім падлягаюць папярэдняму кантролю прамыя замежныя інвестыцыі не толькі ў крытычную інфраструктуру, але і ў тэхналогіі, апрацоўку персанальных звестак, нават інвестыцыі, «якія могуць парушыць незалежнасць медыя».

Аднак далёка не факт, што гэтыя законы здолеюць стрымаць непразрыстых замежных пакупнікоў ва ўмовах, калі прыярытэт будзе аддадзены захаванню рабочых месцаў і падаткаў. У найбліжэйшыя гады дзелавы свет будзе жыць падчас перадзелу ўласнасці. Як адзначае Forbes, усе ўмовы для таго, каб гэты працэс пайшоў, нягледзячы на юрыдычныя і нават палітычныя бар'еры, цяпер склаліся.

### ХАЙТЭК І АПК

Насім Талеб, вучоны, вядомы ва ўсім свеце як стваральнік тэорыі «чорнага лебедзя», у адным са сваіх нядаўніх артыкулаў піша, што ў моманты сістэмных крызісаў выратаванне датычыцца перш за ўсё тых, каго ратаваць... ужо не трэба. Так, у 2008-м асноўны аб'ём ліквіднасці быў накіраваны на банкі, якія ўсяго праз два гады, у 2010-м, выплацілі сабе велізарныя бонусы. Прычым за наступныя дзесяць гадоў сапраўдныя прычыны слабасці сусветнай эканамічнай сістэмы выпраўлены не былі. Перш за ўсё гэта датычыцца маленькага аб'ёму рэальнай вытворчасці. Нават сам вопыт пандэміі будзе падштурхоўваць да гэтага. Як адзначаюць эксперты, структура эканомік ужо ў найбліжэйшай перспектыве пачне змяняцца ў бок прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

| Продажа ценных бумаг | | 11 459 527 | 2 248 878 |
| Чистый (отток)/ приток денежных средств от инвестиционной деятельности | | (174 187) | 77 044 |
| **ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | | |
| Выплата дивидендов | 8.2 | (16 988) | (4 398) |
| Поступление от выпущенных долговых ценных бумаг | | 721 911 | 508 258 |
| Выкуп и погашение собственных долговых ценных бумаг | | (745 343) | (477 538) |
| Чистый денежный отток по расчетам по основному долгу по обязательствам по аренде | 6.19 | (3 416) | - |
| Чистый (отток)/приток денежных средств от финансовой деятельности | | (43 836) | 26 322 |
| ЧИСТОЕ УВЕЛИЧЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ И ИХ ЭКВИВАЛЕНТОВ | | 194 642 | 183 545 |
| ВЛИЯНИЕ ИЗМЕНЕНИЯ КУРСА ИНОСТРАННЫХ ВАЛЮТ НА ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ | | (2 214) | 4 770 |
| **ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ НА НАЧАЛО ПЕРИОДА** | **6.1** | **785 536** | **597 221** |
| **ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ НА КОНЕЦ ПЕРИОДА** | **6.1** | **977 964** | **785 536** |

Председатель Правления
А.С. Бриштелев

Главный бухгалтер
А.Н. Сырокваш

12 марта 2020 года

Минск

Годовая консолидированная финансовая отчетность в соответствии с МСФО размещена на интернет-сайте ОАО «Белинвестбанк» **https://www.belinvestbank.by/about-bank/finance-statistic**

146 www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. УНП 807000028.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 15.01.2019

BDO

Телефон: +375 17 308 74 50
Факс: +375 17 308 74 51
www.bdo.by

ООО «БДО»
пр-т Победителей, 103, этаж 8, помещение 7, Минск, Беларусь, 220020

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО КОНСОЛИДИРОВАННОЙ ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

**Акционерам, Наблюдательному совету, Правлению открытого акционерного общества «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», Национальному банку Республики Беларусь**

**Исх. номер: 04-05/33**

**Дата: 12 марта 2020 года**

### Аудиторское мнение

**Реквизиты аудируемого лица:**
**Наименование:** Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» (сокращенное наименование — ОАО «Белинвестбанк»)
**Место нахождения:** Республика Беларусь, 220002, г. Минск, проспект Машерова, 29
Сведения о государственной регистрации: ОАО «Белинвестбанк» зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 3 сентября 2001 года, регистрационный номер 807000028
**УНП** 807000028

Мы провели аудит консолидированной финансовой отчетности открытого акционерного общества «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» и его дочерних предприятий (далее — «Группа»), состоящей из:

- консолидированного отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2019 года;
- консолидированного отчета о совокупном доходе, консолидированных отчетов об изменении собственного капитала и движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату; а также
- примечаний к консолидированной финансовой отчетности, включающих краткое изложение основных положений учетной политики.

По нашему мнению, прилагаемая консолидированная финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных аспектах консолидированное финансовое положение Группы по состоянию на 31 декабря 2019 года, а также ее консолидированные финансовые результаты и консолидированное движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности (далее — «МСФО»).

### Основание для выражения аудиторского мнения

Мы провели аудит в соответствии с Международными стандартами аудита. Наши обязанности, предусмотренные указанными стандартами, более подробно рассматриваются в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита консолидированной финансовой отчетности» настоящего заключения.

Мы являемся независимыми по отношению к Группе в соответствии с Кодексом этики профессиональных бухгалтеров, разработанным Советом по международным стандартам этики для профессиональных бухгалтеров, и выполнили наши иные обязанности в соответствии с этими требованиями профессиональной этики.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточным и надлежащим основанием для выражения нашего аудиторского мнения.

### Ключевые вопросы аудита

Ключевые вопросы аудита — это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для нашего аудита консолидированной финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте нашего аудита консолидированной финансовой отчетности в целом и при формировании нашего мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения по этим вопросам. В отношении каждого из указанных ниже вопросов наше описание того, как соответствующий вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита, приводится в этом контексте.

Мы выполнили обязанности, описанные в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита консолидированной финансовой отчетности» нашего заключения, в том числе по отношению к этим вопросам. Соответственно, наш аудит включал выполнение процедур, разработанных в ответ на нашу оценку рисков существенного искажения консолидированной финансовой отчетности. Результаты наших аудиторских процедур, в том числе процедур, выполненных в ходе рассмотрения указанных ниже вопросов, служат основанием для выражения нашего аудиторского мнения о прилагаемой консолидированной финансовой отчетности.

**1. Резерв под обесценение кредитов, предоставленных клиентам, а также резерв по обязательствам кредитного характера**

В связи с существенностью резерва под обесценение кредитов, предоставленных клиентам, и обязательств кредитного характера для финансового положения Группы, а также в связи со сложностью и необходимостью применения суждений в отношении оценки ожидаемых кредитных убытков в соответствии с МСФО (IFRS) 9 «Финансовые инструменты» (далее – «МСФО 9»), данный вопрос является одним из ключевых вопросов аудита.

Для определения значительного увеличения кредитного риска с даты первоначального признания, как на индивидуальной, так и на портфельной основе, а также для расчета ожидаемых кредитных убытков необходимо применять суждение. Оценка увеличения кредитного риска основана на относительном изменении в кредитных рейтингах, длительности просроченной задолженности и прочих объективных и субъективных факторах. Выбор пороговых значений, при которых увеличение кредитного риска признается значительным, таких как величина ухудшения кредитного рейтинга, также носит субъективный характер.

В ходе нашего аудита мы обратили особое внимание на следующее:

- оценка моделей кредитного риска и допущений, используемых для определения ключевых параметров резервирования и ожидаемых кредитных убытков по портфелю;
- оценка суждений руководства в отношении выявления значительного увеличения кредитного риска на индивидуальной и портфельной основе, с использованием количественных и качественных критериев;
- тестирование ожидаемых будущих денежных потоков, в том числе денежных потоков, источником которых является обеспечение, в отношении существенных кредитно-обесцененных кредитов, предоставленных клиентам, и обязательств кредитного характера.

Наши аудиторские процедуры включали оценку методологии расчета ожидаемых кредитных убытков, разработанной Группой в соответствии с МСФО (IFRS) 9 для оценки резервов под обесценение кредитов, предоставленных клиентам, а также обязательств кредитного характера.

Расчет ожидаемых кредитных убытков включает методики оценки, в которых используются существенные ненаблюдаемые исходные данные и факторы, такие как внутренние кредитные рейтинги, а также комплексное статистическое моделирование и экспертное суждение. Данные методики используются с целью определения вероятности дефолта, величины кредитного требования, подверженной риску дефолта и уровня потерь при дефолте на основании имеющихся исторических данных и внешней информации, скорректированных с учетом прогнозов, включая прогнозные макроэкономические переменные.

Для расчета ожидаемых кредитных убытков в отношении существенных финансовых активов, подвергнувшихся кредитному обесценению на индивидуальной основе, требуется анализ финансовой и нефинансовой информации и широкое использование допущений. Оценка будущих денежных потоков основывается на таких существенных ненаблюдаемых на рынке исходных данных, как текущие и прогнозные финансовые показатели заемщика, стоимость обеспечения и оценка вероятности возможных сценариев. Использование иных методик моделирования, допущений и прогнозов может привести к существенно иным оценкам резерва под ожидаемые кредитные убытки.

Информация о резерве под ожидаемые кредитные убытки в отношении кредитов, предоставленных клиентам, а также обязательств кредитного характера представлена в примечании 6.3 «Кредиты, предоставленные клиентам», примечании 6.4 «Резервы под ожидаемые кредитные убытки по кредитам клиентам», примечании 11 «Договорные и условные обязательства» и примечании 14 «Политика управления рисками» к консолидированной финансовой отчетности.

Мы оценили разумность факторов кредитного риска и пороговых значений, выбранных руководством для определения значительного увеличения кредитного риска на индивидуальной и портфельной основе. Мы оценили последовательность применения критериев, выбранных руководством, на отчетную дату.

При тестировании обесценения, рассчитанного на портфельной основе, мы проанализировали лежащие в основе статистические модели, ключевые исходные данные и допущения, а также прогнозную информацию, используемую при расчете ожидаемых кредитных убытков. Для выбранных существенных кредитов мы провели проверку внутренних кредитных рейтингов, факторов кредитного риска и классификацию по стадиям. В отношении выбранных нами существенных обесцененных корпоративных кредитов мы, совместно со специалистами в области оценки, проанализировали допущения в отношении будущих денежных потоков, включая стоимость обеспечения и вероятность возможных сценариев. Мы рассмотрели результаты проведенного Группой последующего тестирования моделей, применяемых для целей МСФО (IFRS) 9.

Мы также изучили раскрытия в консолидированной финансовой отчетности Группы касательно резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам, предоставленным клиентам, а также под обязательства кредитного характера.

**2. Справедливая стоимость ценных бумаг**

Оценка справедливой стоимости ценных бумаг является ключевым вопросом аудита в связи с существенным объемом данных ценных бумаг (25 % от совокупной стоимости активов Группы), а также в связи с тем, что оценка справедливой стоимости включает применение профессионального суждения, использование допущений и оценок, а также в связи с существенным влиянием потенциального изменения величины справедливой стоимости ценных бумаг, а также уровня в иерархии справедливой стоимости, на показатели консолидированной финансовой отчетности.

Мы выполнили процедуры в отношении информации, раскрытой в примечании 6.5 «Ценные бумаги, оцениваемые по справедливой стоимости через прочий совокупный доход», примечании 6.6 «Ценные бумаги, оцениваемые по справедливой стоимости через прочий совокупный доход, заложенные по сделкам РЕПО» и примечании 13 «Справедливая стоимость» к консолидированной финансовой отчетности, на предмет полноты и соответствия требованиям МСФО.

Мы провели оценку приемлемости используемых моделей оценки справедливой стоимости и их соответствия применяемым МСФО. Также мы проверили используемые Группой наблюдаемые и ненаблюдаемые данные для оценки справедливой стоимости ценных бумаг путем верификации с источниками информации, такими как: котировки на фондовых рынках, фактические данные о сделках с аналогичными финансовыми инструментами, данные о процентных ставках по аналогичным ценным бумагам. Помимо этого, нами были оценены подходы, используемые Группой при определении уровней иерархии справедливой стоимости.

**3. Оценка зданий и сооружений**

Методы оценки справедливой стоимости зданий могут носить субъективный характер и основываться на различных допущениях о ценообразующих факторах. Различные методы оценки и использование допущений могут оказывать существенное влияние на результат оценки справедливой стоимости. В силу существенности стоимости зданий и сооружений, которая по состоянию на 31 декабря 2019 года составляет 124 097 тыс. рублей, а также высокой степени субъективного суждения и потенциального влияния на консолидированную финансовую отчетность Группы, оценка справедливой стоимости зданий рассматривается нами как один из ключевых вопросов аудита.

Мы выполнили процедуры в отношении информации, раскрытой в примечании 6.10 «Основные средства» к консолидированной финансовой отчетности, на предмет полноты и соответствия требованиям МСФО.

Для определения рыночной стоимости зданий на отчетную дату руководство Группы привлекало независимого оценщика. Наши аудиторские процедуры в отношении оценки недвижимости включали анализ компетентности и объективности независимого оценщика, привлеченного руководством Группы, изучение принятых существенных допущений, а также сопоставление исходных данных, использованных при оценке, с доступной рыночной информацией о стоимости объектов и иными данными, наблюдаемыми на рынке.

### Обязанности аудируемого лица по подготовке консолидированной финансовой отчетности

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление консолидированной финансовой отчетности в соответствии с МСФО и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке консолидированной финансовой отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в консолидированной финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, в том числе Аудиторский комитет, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки консолидированной финансовой отчетности аудируемого лица.

### Обязанности аудиторской организации по проведению аудита консолидированной финансовой отчетности

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что консолидированная финансовая отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с Международными стандартами аудита, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей консолидированной финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с Международными стандартами аудита, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения консолидированной финансовой отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками, направленные на снижение этих рисков; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений консолидированной финансовой отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие, таких как сговор, подлог или подделку документов, умышленные пропуски, представление недостоверных сведений или нарушение системы внутреннего контроля;
- получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей отношение к аудиту консолидированной финансовой отчетности, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;
- оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в консолидированной финансовой отчетности;
- оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности, и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в консолидированной финансовой отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
- оцениваем общее представление консолидированной финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также оцениваем, обеспечивает ли консолидированная финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все этические требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

Заместитель директора по аудиту, Партнер по заданию — Н. В. Ляховченко

Аудитор, возглавлявший аудит — Е. О. Жизневская

Дата аудиторского заключения: 12 марта 2020 года.

Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.

Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 12 марта 2020 года.

Должность, Ф.И.О. Председателя Правления — А. С. Бриштелев

**Сведения об аудиторе:**

| | |
|---|---|
| ***Наименование:*** | Общество с ограниченной ответственностью «БДО». |
| ***Место нахождения:*** | Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр. Победителей, 103, 8 этаж, помещение 7. |
| ***Сведения о государственной регистрации:*** | Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 15 ноября 2013 года. |
| ***УНП*** | 190241132 |

# Музыка на каранціне

**Цяпер увесь свет вымушаны перагледзець звыклы рытм жыцця — мінімізаваць жывыя стасункі, паставіць на паўзу бізнес. На бестэрміновыя канікулы сыходзяць, і прадстаўнікі мастацтва: кінатэатры і тэатры зачыняюцца, паказваюць спектаклі анлайн, выстаўкі адмяняюцца, арганізатары канцэртаў паведамляюць аб пераносе імпрэз самае меншае на некалькі месяцаў. «Звязда» даведалася, чым занятыя беларускія артысты ў перыяд адмен і пераносу канцэртаў.**

«Сядзім дома, сумуем па жывых сустрэчах з публікай, — прызнаюцца музыканты папулярнага **рок-гурта Nizkiz.** — Але пазл склаўся так удала, што ў прыгожую дату разам з добрымі людзьмі і іхнімі камерамі будзем вяшчаць на ўвесь свет». Перакладаем на агульназразумелую мову: увечары 13 красавіка гурт дасць жывы канцэрт і выканае песні з новага альбома «Самнамбула» на платформе voka.tv — бясплатна для ўсіх ахвотных.

Удзельнікі **этна-трыа «Троіца»** да апошняга спадзяваліся правесці канцэрт у КЗ «Мінск» 14 красавіка, які даўно чакалі і слухачы, і самі музыкі. Аднак днямі гурт вымушаны быў перанесці імпрэзу на значна пазнейшы тэрмін — 17 верасня. «Такое рашэнне далося няпроста. Мы не хочам рызыкаваць вашым здароўем і жыццём, збіраючы сотні чалавек у закрытым памяшканні, калі існуе хоць бы адзін шанец са ста, што на канцэрце апынецца хто-небудзь з ужо хворых і патэнцыйна заразны для вас і вашых блізкіх», — канстатуюць удзельнікі калектыву, аднак падкрэсліваюць, што гаворка ідзе не пра адмену, а пра перанос. Музыкі просяць публіку аб разуменні і падтрымцы — то-бок не спяшайцеся здаваць набытыя білеты, яны будуць годныя ў верасні. Калі ўсё ж ёсць неабходнасць вярнуць білет, зрабіць гэта можна будзе толькі пасля 4 мая — да гэтага часу офіс арганізатара канцэрта зачынены.

Гурт сярэдняевечнай музыкі **«Стары Ольса»** адным з першых заклапаціўся здароўем прыхільнікаў і перанёс прэм'еру батлейкі «Трыстан і Ізольда», якую рыхтаваў доўгі час, на нявызначаны тэрмін — «калі небяспека сыдзе», а лекцыю-канцэрт да Дня сярэднявечнай музыкі, які адзначаецца па ўсім свеце штогод 21 сакавіка, правёў без слухачоў, у анлайн-фармаце. А калі стала зразумела, што музычны каранцін значна падоўжыцца, удзельнікі калектыву вырашылі не сядзець без справы і заняцца тым, што даўно адкладвалі, — упарадкаваць фота- і відэаархівы, якія назапасіліся за 20 гадоў існавання калектыву. «Гара ўспамінаў, процьма выступленняў і сустрэч. Пасля канцэртаў мы пакідалі аўтографы на білетах і ў нататніках, фатаграфаваліся афіцыйна і дурасліва, нам дарылі падарункі — ад салодкіх да жалезных, выходзілі касеты і дыскі, журналісты пісалі рэцэнзіі ў выданнях, некаторыя з якіх ужо не існуюць, але іх жоўтыя старонкі жывуць да гэтага часу. Раз-пораз, наводзячы парадак у шафе, перачытваеш і кладзеш назад, усміхаючыся, згадваеш тую падзею і свае думкі. Гэта не хлам і не настальгія, гэта гісторыя, — натхнёна разважае флейтыстка і PR-менеджар гурта Марыя Шарый. — Таму мы ствараем анлайн-музей «Старога Ольсы», які размесцім у нас на сайце, а цяпер збіраем для яго знакавыя фота і відэа, аўдыязапісы і інтэрв'ю, плакаты, дыпломы, гісторыі, фота дыпломаў, атрыбутыкі і іншыя цікавыя рэчы». Па дапамогу гурт звярнуўся да сваёй публікі. І калі вы з тых, хто ўпадабаў музыку «Старога Ольсы» (а мо нават вырас на ёй), вашых фота, успамінаў і гісторый чакаюць на пошту staryolsa.official@gmail.com з пазнакай «Музей Стары Ольса». Да канца красавіка, кажа Марыя Шарый, плануецца сабраць асноўную частку экспанатаў, а далей пастаянна папаўняць калекцыю.

**Дзмітрый КАЛДУН** разам з сям'ёй знаходзіцца ў Мінску і таксама стараецца прытрымлівацца правіл самаізаляцыі. Таму пакуль нават не загадвае, якімі канцэртамі і калі адзначыць будучае 35-годдзе, аднак сувязі са слухачамі не траціць. «Што я раблю? Чытаю кніжкі, якія ўвесь час адкладваў, пішу новыя песні, а яшчэ сёлета ўпершыню пачаў займацца расадай — памідоры чэры вось пасадзіў, і абавязкова буду трымаць вас у курсе, чым справа скончыцца, ці смачны выйдзе ўраджай», — расказвае спявак у адмысловым «каранцінным» відэасюжэце. Насамрэч, ужо сур'ёзна дадае Дзмітрый, хоць ён і дыпламаваны хімік (*скончыў хімфак БДУ. —* **«Зв.»**), але, паколькі не мае практыкі ў набытай прафесіі, «наўрад ці здатны на што-небудзь карыснае», так што альтэрнатывы для сябе, акрамя музыкі, спявак не бачыць.



Дзмітрый КАЛДУН з дачкой Алісай.

**«Гурт «Аўра» —** музыка ў прынцыпе ўдумлівая, лірычная, не запатрабаваная на карпаратывах. Нашы работы заўжды былі прымеркаваныя да вялікіх, знакавых дат, таму асабіста мы не надта адчулі змяншэнне колькасці жывых канцэртаў, — расказвае «Звяздзе» прадзюсар і кампазітар Яўген Алейнік. — З найбліжэйшых праектаў назаву канцэрт у Доме радыё 15 мая — ён адбудзецца, што называецца, пры любым надвор'і, а прамую трансляцыю будзе весці тэлеканал «Беларусь 3». Але мяне як чалавека ўжо негарадскога (год таму Яўген Алейнік і Юлія Быкава перабраліся ў вёску пад Астрашыцкім Гарадком. — **«Зв».**) больш клапоціць участак — паспрабуй, маючы зямлю, нічога на ёй не пасадзіць! Рыхтуем бульбу на пасадку, памідоры, гуркі, кроп, зяленіва рознае, Юля ў перапынках паміж песнямі цэлымі днямі ў агародзе; перажываем толькі, што зямля сухая, бо дажджу даўно не было...» Але і асноўнай дзейнасцю — напісаннем песень — творчы і сямейны дуэт у сваёй натуральнай ізаляцыі працягвае займацца. Цяпер у рабоце, кажа Яўген, дзве новыя кампазіцыі — адна для Іны Афанасьевай, другая ўласна для «Аўры», на восень наогул рыхтуюць шмат прэм'ер. А нядаўна літаральна за дзень знялі кліп для Машы Магільнай на песню «Усё будзе добра»: «Я нешта ўспомніў пра яе і падумаў, што зараз была б якраз дарэчы. Патэлефанаваў бацькам з ідэяй зняць відэакліп, яны пагадзіліся — і мы маленькай дружнай кампаніяй гэта зрабілі, хутка відэа будзе гатовае, пакажам яго ў сеціве».



Яўген АЛЕЙНІК.

Кацярына Іванчыкава, як і іншыя ўдзельнікі **гурта Iowa,** сядзіць на каранціне ў Маскве. Каб заставацца ў норме і ў форме, дзяўчына раіць не толькі фізічную актыўнасць, але і догляд сябе — нават у ізаляцыі, упэўнена Кацярына, важна зранку прыгожа адзецца, нафарбавацца, падабраць аксесуары, каб захаваць пазітыўны настрой. Спявачка жартуе, што вольнага часу ў яе стала нават менш, чым было раней: «Думала і падцягнуць англійскую, і курсы розныя засвоіць, і што да мальберта рукі дойдуць — а ніяк не магу за гэта ўзяцца і нават проста паваляцца з кніжкай, бо ўвесь час вяду перамовы, нешта здымаю і адпраўляю — інтэрв'ю, відэасюжэты, лекцыі, словы падтрымкі. Кватэра ператварылася ў нейкі палявы штаб!»

5 красавіка гурт Iowa зрабіў унікальную рэч — не проста анлайн-канцэрт, а кватэрнік на адлегласці, падчас якога кожны з музыкаў знаходзіўся ў сябе дома. Выступленне ў прамым эфіры можна было паглядзець з любога месца ў свеце.



Віталь КАРПАНАЎ з жалезным «канём».

Не сумуе на каранціне і **гурт «Дразды».** Акрамя таго, што хлопцы актыўна выступаюць у анлайн-канцэртах, яны рыхтуюцца адзначыць 15-годдзе калектыву. «У нас назбіралася неверагодная колькасць работы — алічбаваць і выкласці на інтэрнэт-платформы тыя песні і альбомы, якія выходзілі раней на дысках, — расказвае саліст гурта Віталь Карпанаў. — Ужо выйшлі «Каханак-герой» 2008 года, «Тры рублі» 2012-га і «Шчасце» 2014-га. Акрамя таго, запісваем і новы альбом — планавалі выпусціць яго ўжо гэтай вясной, але перанеслі на восень. Як працуем? Збіраемся ў студыі, пры гэтым выконваем усе рэкамендаваныя меры перасцярогі, затое потым, калі нас спытаюць, што мы рабілі ў гэты час, мы такія — хоп! — і пакажам альбом».

Да таго ж Віталь выкладвае ў сеціве свае вершаваныя жартоўныя замалёўкі ў фірменным «драздоўскім» стылі — гэткія камічныя куплеты. «На аддалёнцы знасіў валёнкі, на аддалёнцы парнік зрабіў з плёнкі, наварыў згушчонкі, накруціў тушонкі, нагнаў самагонкі на аддалёнцы», — зрабіў ён днямі чарговую «справаздачу».

Спявак **Пётр Елфімаў,** які ўжо некалькі гадоў жыве ў Маскве і з'яўляецца вакалістам гурта «Гран-КуражЪ», вымушаны быў адмовіцца ад жывых канцэртаў яшчэ на пачатку вясны. «Мой рабочы механізм — голас — мякка кажучы, прыйшоў у непрыдатнасць, і ўрачы настойліва рэкамендавалі ўзяць паўзу для аднаўлення», — растлумачыў сам спявак, які вытрымліваў некалькі тыдняў цішыні. У цяперашні час, кажа жонка і прадзюсар спевака Таццяна Касмачова, Пётр ачуняў і з ім усё добра — аднак артыст, як пераважная большасць жыхароў расійскай сталіцы, знаходзіцца на жорсткім каранціне. «Чым ратуемся ў абавязковай самаізаляцыі? Працай, канешне, — расказала «Звяздзе» Таццяна Касмачова. — Пётр, які ў лютым стаў дацэнтам кафедры эстрадна-джазавых спеваў маскоўскага Інстытута сучаснага мастацтва, дае ўрокі вакалу анлайн. Пішуцца новыя песні, дарабляем пацііху новы альбом — яго прэзентацыя была прызначаная на канец красавіка, але па зразумелых прычынах, як і тур па гарадах Расіі, перанеслася на восень... Так што дзякуй землякам за падтрымку, усё нармальна».

**Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры»** канцэртную дзейнасць не толькі не прыпыніў, а, здаецца, наадварот, актывізаваў — выканаўцы рэгулярна даюць анлайн-канцэрты, напрыклад, днямі ўзялі ўдзел у дабрачынным марафоне ў падтрымку медыкаў. І хоць гэта збоку можа падавацца лёгкім — падумаеш, прыехаць і паспяваць, але для такіх паездак па розных студыях і шматлікіх стасункаў з арганізатарамі цяпер таксама патрэбная пэўная смеласць... «Не смеласць, а разуменне таго, што гэта неабходна рабіць, — папраўляе мастацкі кіраўнік БДА «Песняры» Раман Козыраў. — Бо артысты як былі, так і засталіся публічнымі асобамі, за іх паводзінамі сочаць многія, і калі зараз зачыніцца ў нейкай яме, што пра цябе падумаюць людзі? На мой погляд, трэба захоўваць такую пазіцыю — бяспечную, дыстанцыйную, але адкрытую, і працягваць працаваць, што мы і робім. Напрыклад, адначасова зводзім канцэртны альбом, запісаны летась з Прэзідэнцкім аркестрам да 50-годдзя «Песняроў», і пішам новы, які плануем скончыць да канца 2020-га. Сын Ігара Лучанка прынёс песню, якую раней ніхто не чуў, — таксама працуем над ёй. І, канешне, будзем працягваць рабіць усё, каб падтрымаць землякоў — не толькі ўрачоў і персанал бальніц, а наогул усіх беларусаў, бо толькі разам, згуртаваўшыся, мы пераможам гэтую заразу».

З апошнім сцвярджэннем застаецца толькі пагадзіцца і пажадаць усім — назапашвайце станоўчыя эмоцыі, слухайце любімую музыку, добрую і розную. Балазе, артысты гатовыя выступіць у любым фармаце.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота з сацыяльных сетак выканаўцаў.**

Рэтрафота — «Стары Ольса» на беразе ручая Ольса, 2003 год.



## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні найлепшым чынам вам будуць давацца задачы, звязаныя з вучобай і развіццём творчага патэнцыялу. Захоўвайце спакой і ўпэўненасць. Не панікуйце, нават калі пачуеце не самыя прыемныя навіны. Аўторак і серада пройдуць пад знакам інтуіцыі і ўмення аналізаваць сітуацыю. Зараз добра наладжваць дзелавыя сувязі. На выхадныя лепш нічога не планаваць і застацца дома.

**ЦЯЛЕЦ.** Тыдзень лепш прысвяціць падрыхтоўцы да рашучых дзеянняў, якія вас чакаюць у канцы месяца. Цяпер важна не ўвязвацца ў авантуры, якія абяцаюць выдатныя перспектывы. Пазбягайце непатрэбных кантактаў. Добрыя вынікі дасць сумесная творчасць, але не варта праводзіць шмат часу ў шумнай кампаніі.

**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні вы будзеце поўныя сіл і настроены на стваральную хвалю. Будзе шанцаваць на патрэбных людзей. Ваша асабістае жыццё зменіцца да лепшага, прычым без намаганняў з вашага боку, проста абставіны складуцца на вашу карысць. З'явіцца шанц вырашыць практычна невырашальныя задачы, пры гэтым улічваючы інтарэсы навакольных. Вы будзеце спакойныя, гарманічныя і каханыя.

**РАК.** На гэтым тыдні вашы цярпенне, веды і ўменне шмат і з азартам працаваць дазволяць праявіць сябе ў якасці сапраўднага прафесіянала. Нягледзячы на дробныя нестыкоўкі і затрымкі ў справах, не адступайцеся ад задуманага плана, і ўсе праблемы ўладзяцца. Верце ў сябе і ў блізкіх людзей.

**ЛЕЎ.** У пачатку тыдня будзьце асцярожныя з новай інфармацыяй. Вашы дасягненні — гэта вельмі пахвальна, але прыйшоў час рухацца наперад, да новага і вельмі цікавага. Праўда, давядзецца рабіць тое, чаго вы раней не ўмелі. Пятніца можа стаць напружаным днём, калі вы дазволіце ўцягнуць сябе ў канфліктную сітуацыю. Успомніце пра сваякоў — цяпер нядрэнны час для прымірэння і аднаўлення адносін.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні спатрэбяцца такія якасці, як прадбачлівасць і ўменне імгненна прымаць рашэнні. Вашы адносіны з начальствам пагражаюць ускладніцца — чакайце прэтэнзій і канфліктных сітуацый. Старайцеся згладжваць вострыя вуглы. Чацвер — удалы дзень для вучобы. У пятніцу дзелавыя перамовы могуць аказацца вельмі плённымі.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні вам па сілах вырашыць не толькі свае задачы, але і некаторыя праблемы навакольных. Каб выклікаць прыхільнасць людзей, усміхайцеся і будзьце больш актыўныя. У панядзелак упартасць у дасягненні мэты прывядзе да добрых вынікаў. У сераду трымайце пад кантролем свае пачуцці, не давайце выхаду агрэсіі. Старайцеся менш бываць у шумных кампаніях, аддавайце перавагу вузкаму колу сяброў.

**СКАРПІЁН.** Настройцеся пазітыўна. Паспрабуйце спакайней ставіцца да раптоўных перамен сітуацыі. Усё, што робіцца, будзе да лепшага. Вы паспееце вельмі многа, заробіце буйную суму. З'явіцца магчымасць атрымаць патрэбную інфармацыю, якая дазволіць пашырыць вашы магчымасці. Прыемныя падзеі могуць адбыцца з дзецьмі. Парадуе асабістае жыццё. Нарэшце вы будзеце менавіта з тым чалавекам, якога кахаеце.

**СТРАЛЕЦ.** Калі вы не будзеце падганяць падзеі або праяўляць залішнюю нервовасць і нецярпенне, то тыдзень абяцае быць спакойным. У аўторак сям'я і сябры падтрымаюць і дапамогуць у сітуацыі, якая склалася. У чацвер, пятніцу і суботу пажадана паступова завяршыць пачатыя справы, без спеху і мітусні. Выхадныя — выдатны час для творчых заняткаў. У нядзелю не выключаны прыемныя нечаканасці.

**КАЗЯРОГ.** На вас могуць звaліцца і праблемы, і поспехі адначасова. Гэта крыху заблытае. Жыццё вяртае вас да тых жа спраў і цяжкасцяў, якія вы, здавалася, ужо пераадолелі. Не страшна — вы ж ужо ведаеце, як вырашыць гэтыя задачы. У сераду вам будзе спадарожнічаць фінансавы поспех. Выхадныя лепш правесці дома.

**ВАДАЛІЎ.** На рабоце можа чакаць удача, у многіх пытаннях вы будзеце проста незаменныя. Аднак, адчуўшы прыліў энергіі, не варта хапацца за шмат спраў адразу, лепш спыніцца на чымсьці адным, найбольш значным. Для рэалізацыі маштабных планаў спатрэбіцца старанная падрыхтоўка. Прысвяціце выхадныя сямейным справам і дзецям, ім неабходны цесныя зносіны з вамі.

**РЫБЫ.** Дастаткова напружаны тыдзень: давядзецца прымаць новыя выклікі і спраўляцца з незнаёмымі задачамі. Вам могуць прапанаваць цікавую работу. У сераду ад неасцярожнага слова пагражаюць ускладніцца адносіны з блізкімі або калегамі. У чацвер могуць усплыць старыя крыўды. Прысвяціце добраўпарадкаванню свайго дому хоць адзін дзень. У суботу можаце разлічваць на дапамогу і падтрымку сяброў.

## Даты | Падзеі | Людзі

### 11 КРАСАВІКА

**У краіне**

**1855** год — нарадзіўся (Брэст) Арсеній Іванавіч Маркевіч, гісторык, архівіст, грамадскі дзеяч, член-карэспандэнт АН СССР (1927). Аўтар прац па археалогіі і гісторыі Крыма. Адзін з арганізатараў Таўрычаскага ўніверсітэта, мясцовых музеяў і архіваў.



**1876** год — касцёл Бялыніцкага манастыра кармелітаў асвечаны ў праваслаўную царкву Раства Багародзіцы.

**1911** год — нарадзіўся Мікалай Мікалаевіч Розаў, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**1963** год — нарадзіўся Ігар Міхайлавіч Басінскі, беларускі спартсмен (стралковы спорт, кулявая стральба), заслужаны майстар спорту СССР (1986), заслужаны майстар спорту Беларусі (1994), заслужаны трэнер Беларусі (2011). Сярэбраны (1996, 2000) і бронзавы (1988, 1996) прызёр Алімпійскіх гульняў. Чэмпіён свету (1986, 1990), сярэбраны (1986, 1990, 1994, 1998) і бронзавы (1986, 1998) прызёр чэмпіянатаў свету. Неаднаразовы чэмпіён Еўропы, 10-разовы пераможца этапаў Кубка свету, 8-разовы чэмпіён СССР.

**У свеце**

**1805** год — у Санкт-Пецярбургу заключана руска-англійская канвенцыя аб намеры стварыць агульнаеўрапейскую кааліцыю супраць напалеонаўскай Францыі. Пазней да канвенцыі далучыцца Аўстрыя.

**1810** год — нарадзіўся Генры Крэсвік Роўлінсан, англійскі дыпламат і ўсходазнавец, адзін з заснавальнікаў асіралогіі.



**1890** год — нарадзіўся Мікалай Аляксеевіч Бабрынскі, расійскі вучоны-арнітолаг і заагеограф, педагог, доктар біялагічных навук.

**1905** год — нарадзіўся Уладзімір Рыгоравіч Шапашнікаў, расійскі вучоны-астраном.

**1968** год — нарадзіўся Сяргей Васілевіч Лук'яненка, расійскі пісьменнік-фантаст. Аўтар раманаў з серый «Дазоры», «Дыптаўн» і іншых.

**Так гаварыў...**

**АМАР ХАЯМ:**
*«Піць можна ўсім, знаць трэба толькі:
Дзе, з кім, калі, за што і колькі».*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.17 | 20.05 | 13.48 |
| Віцебск | 6.05 | 19.57 | 13.52 |
| Магілёў | 6.07 | 19.55 | 13.48 |
| Гомель | 6.07 | 19.49 | 13.42 |
| Гродна | 6.33 | 20.19 | 13.46 |
| Брэст | 6.36 | 20.17 | 13.41 |

### Месяц

***Поўня 8 красавіка.***
***Месяц у сузор'і Стральца.***

### Імяніны

***Пр.** Астапа, Івана, Кірылы, Марка.*
***К.** Ізольды, Лявона, Станіслава, Філіпа.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | |
|---|---|
| ВАРШАВА | +18..+20°С |
| ВІЛЬНЮС | +12..+14°С |
| КІЕЎ | +10..+12°С |
| МАСКВА | +5..+10°С |
| РЫГА | +6..+7°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +6..+8°С |

## УСМІХНЕМСЯ

Пасля доўгай адсутнасці прыязджае дачнік.

— Суседка, ты не бачыла, хто дровы з маёй павеці спёр?

— У цябе, з хлява?! Не, не бачыла! Ды і адкуль у цябе дровы? Так, лучыны адны, і то не гараць. Вось у суседа твайго — дровы дык дровы! Не, не бачыла!

**— Чаму ты ляжыш і нічога не робіш?**

**— Таму што ўсё, што не робіцца, усё да лепшага.**

Перавялі на аддалены рэжым работы. Ужо два разы спазніўся на працу.

**Каб ты мяне сапраўды кахала, ты б выйшла замуж за каго-небудзь іншага!**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1282.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 красавіка 2020 года.